ЗВЯЗДА 1 снежня 2009 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# У БЕЛАРУСІ НЕМАГЧЫМА ЎСТАНАЎЛЕННЕ ДЫКТАТУРЫ

**Галоўнымі тэмамі, якія плануюць абмеркаваць Аляксандр Лукашэнка і Сільвіа Берлусконі падчас візіту прэм'ер-міністра Італіі ў Беларусь, будуць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, развіццё нарматыўна-прававой базы адносінаў дзвюх краін, а таксама перспектывы інвестыцыйных праектаў. Аб гэтым сказаў Прэзідэнт Беларусі ў інтэрв'ю італьянскай газеце La Stampa.**

Адказваючы на пытанне італьянскага журналіста аб гарантыях у плане дэмакратызацыі, якія Беларусь магла б прадаставіць Сільвіа Берлусконі, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Я не думаю, што Сільвіа едзе сюды за нейкімі гарантыямі дэмакратызацыі. Што датычыцца дэмакратыі, мы можам яшчэ і падзяліцца гэтым дарам».

«Нагадаю, што міністр замежных спраў Франка Фраціні і іншыя прадстаўнікі Італіі, пабываўшы ў Беларусі, пацвердзілі, што тут спрыяльны інвестыцыйны клімат і буйныя бізнэсмены сёння гатовы інвеставаць у беларускую эканоміку. Вось гэта і будзе галоўнае кола пытанняў», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў, што «па гэтых пытаннях кіраўнік італьянскага ўрада атрымае ад нашай дзяржавы самыя цвёрдыя гарантыі».

Прэзідэнт падкрэсліў важную ролю, якую Італія адыграла ў наладжванні адносінаў Беларусі з ЕС. «І тут заслуга перш за ўсё двух людзей — Франка Фраціні і Сільвіа Берлусконі», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. «За апошнія месяцы ў нас пабывала каля двух дзясяткаў буйных палітычных фігур Еўрасаюза, і практычна ўсе яны адзначалі, што Беларусь з'яўляецца сапраўды еўрапейскай дзяржавай», — сказаў ён.

Беларусь будзе і далей прытрымлівацца той мадэлі прыватызацыі эканомікі, якая была ў апошнія гады.

«Што датычыцца прыватызацыі, думаю, гэта сёння не тое пытанне, якое больш за ўсё хвалюе беларусаў, і якое будзе гучаць на перагаворах з прэм'ер-міністрам Італіі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Прыватызацыя ў нас як ішла, так і ідзе. Яна мае спецыфічны характар: не з'яўляецца абвальнай (калі ўсё прадаюць за капейкі)».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што, па-першае, прадаваць свае прадпрыемствы беларуская дзяржава «будзе толькі тым, хто заплаціць вялікія грошы, хто дасць грошай больш, чым яго канкурэнты, прапануе добры інвестыцыйны праект і захавае рабочыя месцы». Па-другое, прыватызацыя эканамічных аб'ектаў будзе кропкавай.

«Для мяне як для чалавека, які апошнім ставіць подпіс пад дакументам пры рэалізацыі таго ці іншага прадпрыемства, самае галоўнае, каб гэта прадпрыемства павялічыла выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі, забяспечыла прыстойную зарплату і плаціла падаткі. Але ні ў якім выпадку каб не адбылося так, як у многіх постсацыялістычных краінах, дзе прыйшлі людзі, скупілі прадпрыемствы за паўцэнта, потым іх закрылі, а людзей выкінулі на вуліцу. Нам такая прыватызацыя не патрэбна! І такой прыватызацыі нам удалося пазбегнуць».

Імкненне Беларусі да ўмацавання дыялога з Еўрасаюзам абгрунтавана тым, што Беларусь аб'ектыўна з'яўляецца еўрапейскай дзяржавай, а ніяк не цяжкасцямі ў адносінах з Расіяй, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі ЕС хоча аб'яднаць усю Еўропу, то ён не можа не заўважаць Беларусь, роўна як і Украіну», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў прыярытэтнасць адносінаў з Расіяй для беларускай дзяржавы. «У нас вельмі добрыя адносіны з Расіяй. Няма іншай такой дзяржавы ў свеце, з якой у нас былі б адносіны такога ўзроўню, як з Расіяй. Хоць і праблем у нас хапае», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што тавараабарот Беларусі з краінамі ЕС супастаўны з тавараабаротам з Расіяй. «І я як палітык абавязаны дыпламатычнымі і палітычнымі метадамі забяспечваць падтрымку гэтага гандлю», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў адносінах з Захадам беларуская дзяржава не мае намеру адмаўляцца ад нацыянальных інтарэсаў і згодна весці дыялог толькі пры павазе да яе суверэнітэту і неўмяшанні ва ўнутраныя справы. «Паўзці на каленях мы не маем намеру. У нас няма той сітуацыі, каб мы, дрыжачы ў каленях або ўсім целам, беглі ў Еўрасаюз. Мы прапануем супрацоўніцтва, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Калі ў еўрапейцаў ёсць цікавасць да беларускай дзяржавы — прыязджайце, мы да вас будзем прыязджаць, будзем супрацоўнічаць».

Кіраўнік беларускай дзяржавы ўпэўнены, што ў будучым адносіны Беларусі і Злучаных Штатаў Амерыкі істотна палепшацца.

Паводле яго слоў, пакуль прайшло вельмі мала часу з той пары, як да ўлады ў ЗША прыйшла новая адміністрацыя. «Але нагнятання абстаноўкі вакол нашых адносінаў з Вашынгтонам мы не бачым. Гэта добры сігнал для нас». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што любы націск на Беларусь, з якога б боку ён ні ажыццяўляўся, — контрпрадукцыйны. «Ёсць агульнасусветны дэмакратычны прынцып неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы і адмова ад націску на яе».

Беларусь не прыпыняла працэс усынаўлення дзяцей замежнымі грамадзянамі, заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Я перакананы, што італьянцы, якія хочуць усынавіць беларускіх дзяцей, не толькі могуць спадзявацца на станоўчы разгляд запытаў, але і змогуць усынавіць», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Пры гэтым ён дадаў: «Мы хочам, каб правы ўсыноўленага беларускага дзіцяці былі раўназначныя правам італьянскага дзіцяці».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў Італіі да беларускіх дзяцей ставяцца з вельмі вялікай увагай, цеплынёй і любоўю. «Напэўна, ніхто з іншаземцаў так не ставіцца да нашых дзяцей, як італьянцы».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не выключае, што ў агляднай будучыні ў Беларусі можа адбыцца сустрэча Папы Рымскага Бенядыкта XVI і Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.

«Што датычыцца сустрэчы Папы Рымскага і Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі, гэта пытанне саміх вышэйшых духоўных іерархаў — усё залежыць ад іх. Асабіста я перакананы, што гэта было б на карысць усяму хрысціянскаму свету, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але Папа добра ведае прэтэнзіі да каталіцкай царквы з боку нашага Патрыярха. Калі ў гэтым дыялогу будуць зрухі, то мы станем сведкамі такой сустрэчы».

Прэзідэнт адзначыў, што калі кіраўнікі дзвюх галін хрысціянства дамовяцца аб такой сустрэчы ў Беларусі, гэта стане сапраўдным падарункам беларускаму народу.

Інфармацыйная кампанія, якая зрабіла б пытанне аб магчымай адмене ў Беларусі пакарання смерцю больш адчувальным для насельніцтва, будзе праводзіцца ў нашай краіне ў найбліжэйшы час, паведаміў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы тыдзень таму вызначыліся, што пачынаем шэраг мерапрыемстваў у гэтым напрамку пачынаючы з парламенцкіх слуханняў і ўзняцця гэтай тэмы ў СМІ, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але вырашальным у пытанні адмены смяротнай кары будзе толькі меркаванне народа».

Беларускі лідар заўважыў, што пакаранне смерцю як від крымінальнага пакарання захоўваецца ў ЗША, якія ў той жа час чамусьці патрабуюць больш хуткай адмены найвышэйшай меры пакарання ў Беларусі.

У Беларусі немагчыма ўстанаўленне дыктатуры, заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«У Беларусі няма для гэтага падстаў. Гэтак жа, як не можа быць сёння ўстаноўлены дыктатарскі рэжым у Італіі або якой-небудзь іншай еўрапейскай дзяржаве, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта магчыма ў ЗША, Кітаі, часткова ў Расіі — у самадастатковых дзяржавах, якія могуць існаваць практычна незалежна, нават калі на іх навaліцца ўвесь свет». Паводле слоў беларускага лідара, «калі мы паспрабавалі б гэта зрабіць у Беларусі, нас бы раздавілі на працягу сутак». «І правільна зрабілі б. Таму што ў сучасным свеце дыктатура непрымальная», — дадаў ён.

«Што датычыцца свабоды дэманстрацый, выказвання меркаванняў, думаю, у нас нікольк не менш магчымасцяў для гэтага, чым у Італіі, — лічыць Прэзідэнт. — Вы ведаеце, я, калі бачу некаторыя кадры заходніх журналістаў аб замежнай рэчаіснасці, то мне неяк страшнавата тэлевізар глядзець. Вы там і вадамёты, і дубіны, і слёзатачывы газ — усё прымяняеце для таго, каб забяспечыць грамадскі парадак. У «дыктатарскай дзяржаве» Беларусі такога ніколі не было».

Кіраўнік дзяржавы пажартаваў, што дзеячам беларускай апазіцыі нядрэнна было б прайсці стажыроўку ў адной з заходнееўрапейскіх краін, «каб яны ўдыхнулі гэты слёзатачывы газ і атрымалі па рэбрах паліцэйскімі дубінкамі. Тады б яны разумелі, што такое апазіцыя і што такое грамадскі парадак, які трэба захоўваць у дзяржаве».

«Хачу, каб вы зразумелі: еўрапейцы, ідучы на размову са мной, павінны ўсведамляць, што інтарэсы тых людзей, якія зрабілі мяне прэзідэнтам, для мяне непарушныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Нават у дэмакратызацыі па-еўрапейску для мяне і кіраўніцтва дзяржавы суверэнітэт і незалежнасць краіны, унутрыпалітычная стабільнасць з'яўляюцца святымі», — дадаў ён.

На думку Прэзідэнта, для таго каб забяспечыць нармальнае развіццё Беларусі, дастаткова тых дзяржаў, з якімі наладжаны цудоўныя адносіны. Сярод партнёраў — Расія, Кітай, Індыя, краіны арабскага свету, а таксама дзяржавы Лацінскай Амерыкі і Афрыкі. ЕС павінен разумець, што Беларусь выступае за супрацоўніцтва на прызнаных у свеце прынцыпах.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# Умовы імпарту алкагольнай прадукцыі ў Беларусі ўдасканальваюцца

**Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка 30 лістапада падпісаў Дэкрэт № 12 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лютага 2008 г. № 3».**

Дэкрэт прадугледжвае прадастаўленне міжведамаснай камісіі па арганізацыі і правядзенні конкурсаў на вызначэнне юрыдычных асобаў, якія забяспечваюць рэалізацыю выключнага права дзяржавы на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі (далей — міжведамасная камісія), дадатковых паўнамоцтваў на прыняцце станоўчых рашэнняў у тым выпадку, калі ў конкурсе ўдзельнічае толькі адна юрыдычная асоба.

Пры арганізацыі конкурсу міжведамасная камісія не пазней, як за 30 дзён да яго правядзення, абавязана публікаваць у друкаваных сродках масавай інфармацыі, вызначаных Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, паведамленне, у якім павінны быць названы прадмет і ўмовы конкурсу, дата і месца яго правядзення, тэрміны пачатку і завяршэння прыёму заяў на ўдзел у конкурсе і конкурсных прапаноў, адрас, кантактныя тэлефоны (факс) міжведамаснай камісіі.

Інфармацыя аб аб'яўленым конкурсе і яго прадмеце дадаткова размяшчаецца ў інтэрнэце, і доступ да яе павінен бясплатна прадастаўляцца зацікаўленымі асобамі.

Будучыя ўдзельнікі конкурсу маюць права атрымліваць звесткі аб затратах на яго арганізацыю і правядзенне, парадку і тэрмінах іх кампенсацыі.

У дэкрэце замацоўваецца норма аб тым, што пераможцы конкурсу абавязаны кампенсаваць затраты на яго арганізацыю і правядзенне, уключаючы затраты па раней праведзеных безвыніковых конкурсах.

Палажэнні дэкрэта пашыраюць магчымасці міжведамаснай камісіі пры арганізацыі імпарту алкагольнай прадукцыі і адначасова захоўваюць належны дзяржаўны кантроль за вытворчасцю і абаротам гэтай таварнай групы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# СУМЯШЧАЛЬНІКАМ ЗНІМУЦЬ ЛІМІТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сапраўды, практыка пераходу на скарочаную занятасць і адміністрацыйныя водпускі існуе ва ўсім свеце. Мэта відавочная — захаваць персанал. Разам з тым не сакрэт, што вынікам тут становіцца страта работнікамі даходаў. Таму сёлета ўжо прынятае рашэнне — грамадзяне, якія знаходзяцца ў вымушаных водпусках, могуць удзельнічаць у платных грамадскіх работах. Аднак, мяркуюць спецыялісты, пакуль гэтага недастаткова.

— Каб зноў-такі захаваць працоўныя калектывы, трэба замацаваць норму, паводле якой у перыяд няпоўнай занятасці работнік мог бы часова ўладкоўвацца ў іншыя арганізацыі — але з гарантыяй, што за ім захаваецца ранейшае месца, на якое заўсёды можна вярнуцца, — лічыць намеснік генеральнага дырэктара Рэспубліканскай асацыяцыі прадпрыемстваў прамысловасці Віктар Цімафееў. — Плюс да таго, не варта скідваць з рахункаў магчымасці дробнага бізнэсу.

Але тут для работнікаў, якія часова занятыя ў няпоўным рэжыме, неабходна максімальна спрасціць працэдуру спынення прадпрымальніцкай дзейнасці. Бо праблема хуткага адкрыцця сваёй справы збольшага вырашаная — зрабіць гэта можна за 2-4 дні. А вось на тое, каб гэту справу закрыць, часам ідзе паўгода.

## МІГРАЦЫЯ ПАКУЛЬ НЕ ЛЕПШЫ ВАРЫЯНТ

Працоўныя месцы і стабільныя даходы — першнаперш пытанне эканомікі. На жаль, прагнозы не спраўдзіліся, сусветны крызіс не закончыўся ў першай палове гэтага года, айчынныя вытворцы па-ранейшаму адчуваюць цяжкасці з попытам на сваю прадукцыю за мяжой. У такой сітуацыі, адзначыў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, трэба шукаць дадатковыя рэзервы — гаворка аб развіцці лізінгавых схемаў, ільгатаванні банкаўскіх ставак пакупнікам беларускай прадукцыі ў Расіі, аб выхадзе на новыя рынкі збыту. Усё гэта павінна прынесці вынік. Аднак некаторыя спецыялісты сцвярджаюць: наступны год можа стацца для эканомікі не прасцейшым за гэты год. І ў сувязі з гэтым ужо распрацаваны шэраг дадатковых антыкрызісных мераў, якія павінны зменшыць напружанне на рынку працы.

Як паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр Грушнік, па-першае, чакаецца, што работнікам, якія знаходзяцца ў вымушаных водпусках без утрымання, будзе дадзена права ўладкоўвацца па сумяшчальніцтве на поўны працоўны дзень — цяпер Працоўны кодэкс абмяжоўвае магчымасці сумяшчальніцкай занятасці 20 гадзінамі ў тыдзень. Па-другое, міністэрства прапануе, каб наймальнікі пісьмова паведамлялі ў службы занятасці аб увядзенні рэжыму няпоўнай занятасці ці аб наяўнасці свабодных вакансій ужо на працягу трох дзён. Пры гэтым на «праблемных» прадпрыемствах могуць з'явіцца кансультацыйныя пункты, дзе будзе наладжана інфармаванне работнікаў па працаўладкаванні і працоўным заканадаўстве.

Трэцяя прапанова міністэрства датычыцца павелічэння памеру дапамогі па беспрацоўі. Яе плануецца «прывязаць» не да базавай велічыні, а да бюджэту пражытковага мінімуму. Нарэшце, ёсць намер зрабіць больш жорсткімі ўмовы ўзгаднення наймальнікамі дазволаў на прыцягненне ў Беларусь работнікаў з-за мяжы. Такі крок, заўважыў Пётр Грушнік, варта разглядаць як спробу абароны нацыянальнага рынку працы.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ІНФРАСТРУКТУРА «ГУБЛЯЕ» БАР'ЕРЫ

**На працягу двух апошніх гадоў для карыстання інвалідамі былі прыстасаваныя больш за 5 тысяч аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Як вынік, паведаміла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА, у цэлым па краіне людзі з абмежаванымі магчымасцямі без перашкод могуць карыстацца прыкладна 30 працэнтамі сацыяльных аб'ектаў. Прычым да 2011 года гэты паказчык павінен зноў-такі ўзрасці — да 50 працэнтаў.**

Паводле звестак міністэрства, з пачатку года колькасць інвалідаў у нашай краіне зменшылася на 2857 чалавек. Разам з тым, даводзіцца канстатаваць: абмежаваныя магчымасці ў больш за паўмільёна беларусаў, у краіне налічваецца 72,6 тысячы інвалідаў першай, 271,4 тысячы— другой, 136,4 тысячы — трэцяй групы, а таксама амаль 26 тысяч дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў.

Між тым не сакрэт, што асноўнай крыніцай даходаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі застаюцца пенсіі. У залежнасці ад наяўнасці стажу яны могуць быць працоўнымі або сацыяльнымі. Пры гэтым, заўважыла Валянціна Каралёва, у параўнанні з большасцю атрымальнікаў пенсій па ўзросце інваліды маюць пэўныя перавагі: напрыклад, пенсія інвалідам I групы прызначаецца ў памеры 75, II групы — у памеры 65, III групы — у памеры 40 працэнтаў сярэднямесячнага заробку. Для параўнання, «звычайная» пенсія ў памеры 75 працэнтаў заробку прызначаецца мужчынам пры стажы не менш за 45 і жанчынам — пры стажы не менш за 40 гадоў.

Апроч таго, для людзей з абмежаванымі магчымасцямі вызначаныя і іншыя дадатковыя гарантыі: пераразлік пенсіі па інваліднасці ў выпадку, калі інвалід прапрацаваў пасля яе прызначэння год з больш высокім заробкам; надбаўка на догляд да пенсіі інвалідаў I групы і адзінокіх інвалідаў II групы, якія маюць патрэбу ў дапамозе збоку; павышэнне пенсіі па ўзросце інвалідам з дзяцінства, інваліднасць якім вызначана пажыццёва.

У цэлым, нагадала Валянціна Каралёва, з пачатку гэтага года сацыяльныя пенсіі пераразлічваліся чатыры разы, прычым іх рост склаў 10,5 працэнта. А пенсіі працоўныя павышаліся аднойчы ў лістападзе — таксама больш чым на 10 працэнтаў. Як вынік, у пачатку лістапада памер сярэдняй працоўнай пенсіі па інваліднасці склаў 392,7 тыс., а сацыяльнай пенсіі для інвалідаў з дзяцінства — 188,6 тыс., для інвалідаў з прычыны агульнага захворвання — 160,3 тыс., дзяцей-інвалідаў — 197 тыс. рублёў.

Разам з тым, жыццё на пенсію — варыянт, прымальны не для ўсіх. У міністэрстве падкрэсліваюць: апошнім часам усё больш інвалідаў (і перш-наперш III групы — часцей за ўсё медыцынскіх супрацьпаказанняў не мае менавіта гэта катэгорыя) выказваюць жаданне працаваць. З сярэдзіны мінулага дзесяцігоддзя колькасць людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія звярнуліся ў службы занятасці, узрасла больш чым у 3,5 раза. Пры гэтым, нагадала намеснік міністра, у большасці зваротаў станоўчы вынік — і ў тым ліку дзякуючы «мэтаваму» браніраванню працоўных месцаў і перанавучанню. Падобная практыка працягнецца і надалей.

Выйсце ў па-сапраўднаму цяжкіх выпадках — адрасная сацыяльная дапамога. Умова для яе атрымання штомесяц — даход менш за 100 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. Што да дапамогі аднаразовай, то тут правілы павінны змяніцца з новага года: неабходная «планка» даходаў узрасце са 120 да 150 працэнтаў БПМ.

З новага года вырашыцца таксама і праблема з забеспячэннем тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі інвалідаў III групы і дзяцей да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў дапаможных прыстасаваннях. Пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў тэхнічныя сродкі рэабілітацыі гэтым катэгорыям будуць прадстаўляцца без уліку даходаў.

Сам пералік сродкаў рэабілітацыі, якімі забяспечваюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі, увесь час пашыраецца. Толькі за апошні час гэты пералік папоўнілі інвалідная каляска з электрыфікаваным прывадам, прыстасаванне для праслухоўвання агучанай літаратуры і сотавыя тэлефоны, здольныя сінтэзаваць гаворку.

Ёсць выпадкі, калі абысціся без дома-інтэрната, на жаль, ужо нельга. Разам з тым, зазначаюць у міністэрстве, такі пераезд, з усіх пунктаў гледжання, не самы лепшы. Таму пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання працягваецца стварэнне так званых аддзяленняў кругласутачнага знаходжання, прызначаных для пенсіянераў і інвалідаў, якім цяжка жыць самастойна толькі пэўны час — скажам, узімку. Сёння кругласутачныя аддзяленні ўжо працуюць у 49 раёнах, а ў 112 тэрытарыяльных цэнтрах для інвалідаў створаныя аддзяленні дзённыя — з гурткамі па інтарэсах і рэабілітацыйна-працоўнымі майстэрнямі.

Затрымацца дома дапамагае і сацыяльнае абслугоўванне. Супрацоўнікі сацыяльнай службы рэгулярна наведваюць 23,4 тыс. інвалідаў. Да слова, паслугі адзінокім і малазабяспечаным інвалідам робяцца бясплатна, а малазабяспечаным інвалідам, якія жывуць асобна ад дзяцей, — на ўмовах 50-працэнтнай аплаты. Пры гэтым, падкрэсліла Валянціна Каралёва, робіцца ўсё, каб непасрэдна тарыфы на паслугі былі даступнымі. Напрыклад, у сталіцы «норма-гадзіна» сацыяльнага работніка ацэньваецца ў 1069, а ў Мінскай вобласці — у тысячу рублёў.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ПАСЛУГІ НАБРАЛІ «ВАГУ»

**Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за сёлетнія студзень—верасень сярэднія рэсурсы (грашовыя, натуральныя даходы, ільготы і датацыі) адной хатняй гаспадаркі нашай краіны склалі 1,5 мільёна рублёў у месяц. Прычым у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года гэты паказчык павялічыўся на 14, тады як цэны на тавары і паслугі — на 13,9 працэнта.**

Адначасова, як паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення па рабоце з карыстальнікамі статыстычнай інфармацыяй Алена Кандрацэнка, у сярэднім у сёлетніх студзені—верасні рэсурсы ў разліку на аднаго члена хатняй гаспадаркі склалі 598,6 тыс. рублёў. Пры гэтым у сем'ях без дзяцей гэты паказчык быў вышэйшы — 676,2 тысячы. Аднак у сем'ях з 1 дзіцем рэсурсы складалі 558,8 тыс., з 2 дзецьмі — 479 тыс., а ў сем'ях, дзе выхоўваецца трое і больш дзяцей, — 337,6 тыс. рублёў. Адзначаецца пэўная розніца і ў залежнасці ад месца пражывання. Так, выбарачнае абследаванне хатніх гаспадарак засведчыла: рэсурсы на аднаго чалавека ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу аказаліся ў 1,2 раза большымі, чым у вёсках — 626,7 і 517,6 тысячы рублёў адпаведна.

Падобная раскладка назіраецца і пры ацэнках узроўню жыцця. У студзені—верасні рэсурсамі ніжэй за адзнаку бюджэту пражытковага мінімуму валодалі 5,6 працэнта вяскоўцаў і 3,1 працэнта гараджан. У цэлым жа па краіне сёлета гэты паказчык аказаўся 3,8, тады як за аналагічны перыяд летась — 4,2 працэнта.

Што да спажывецкіх выдаткаў, то ў студзені—верасні на адну хатнюю гаспадарку краіны яны складалі 1126,5 тысячы рублёў у месяц. Да слова, выбарачныя абследаванні паказалі, што ў параўнанні з мінулым годам сёлета ў структуры выдаткаў беларусаў скарацілася доля такіх артыкулаў, як прадукты харчавання, алкагольныя вырабы і нехарчовыя тавары, затое ўзрасла доля паслуг. Перш-наперш апошняе тлумачыцца ростам цэнаў на жыллёва-камунальныя і бытавыя паслугі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Спорт-тайм

### СЕМ МЕДАЛЁЎ — СЁМАЕ МЕСЦА

Беларускія штангісты занялі 7-е месца ў агульным медальным заліку на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы, які прайшоў у Паўднёвай Карэі. Па суме дваябор'я нашы суайчыннікі двойчы станавіліся сярэбранымі прызёрамі — Настасся Новікава і Сяргей Лагун. Яшчэ пяць малых медалёў беларусы заваявалі ў асобных практыкаваннях. Лагун выйграў «золата» ў штуршку і «бронзу» ў рыўку, Новікава заваявала дзве сярэбраныя ўзнагароды — у рыўку і штуршку, Ганна Бацюшка (63 кг) стала сярэбраным прызёрам у рыўку. З-за траўмы, атрыманай на трэніроўцы, на памост не змог выйсці сусветны рэкардсмен і алімпійскі чэмпіён-2008 Андрэй Арамнаў (да 105 кг).

### ПРЫЗАВАЯ ЧАЦВЁРКА АД МЕЛІТЫ

У Берліне завяршыўся фінал Гран-пры па мастацкай гімнастыцы — падагульняльны турнір года, куды дапускаюцца лепшыя спартсменкі сезона. У мнагабор'і Меліта Станюта замкнула прызавую тройку, прапусціўшы наперад расіянак — алімпійскую чэмпіёнку-2008 Яўгенію Канаеву і Дар'ю Кандакову. Яшчэ тры ўзнагароды беларуска заваявала ў асобных відах практыкаванняў. У кампазіцыях з абручом і стужкай яна стала сярэбраным прызёрам, а ў практыкаванні са скакалкай ёй дасталася «бронза».

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВАТЫКАН АСУДЗІЎ ЗАБАРОНУ НА БУДАЎНІЦТВА МІНАРЭТАЎ У ШВЕЙЦАРЫІ

**Ватыкан у панядзелак падтрымаў цвёрдую пазіцыю канферэнцыі швейцарскіх біскупаў, якая выступіла рэзка супраць вынікаў нядзельнага рэферэндуму, паводле якіх грамадзяне гэтай еўрапейскай краіны выказаліся за забарону на надбудову мінарэтаў у дзейных на тэрыторыі Швейцарыі мячэцях.**

Канферэнцыя біскупаў Швейцарыі ўвечары ў нядзелю распаўсюдзіла заяву пра тое, што волевыяўленне швейцарцаў «узнімае праблемы суіснавання дзвюх канфесій». Заява Ватыкана рушыла ўслед за хваляй крытыкі з іншых еўрапейскіх краін, паведамляе The Daily Telegraph. Раней у панядзелак міністр замежных спраў Францыі Бернар Кушнер сказаў, што быў «абураны» рашэннем швейцарцаў і расцаніў меркаванне грамадзян гэтай краіны як праяву «неталерантнасці» ўсходняга суседа Францыі. Паміж тым, у строга свецкай Францыі заканадаўцы актыўна абмяркоўваюць увядзенне забароны на нашэнне хіджаба — іншага неад'емнага знака ісламскай культуры.

Паводле афіцыйных вынікаў рэферэндуму, забарону на будаўніцтва мінарэтаў падтрымалі большасць кантонаў, а таксама 57 працэнтаў насельніцтва краіны. Мусульмане ўсяго свету расцанілі нядзельнае галасаванне як «антыісламскае». Цяпер у Швейцарыі пражывае 400 тысяч мусульман.

### У РАСІІ РЭЗКА ПАДАРАЖЭЛА МАЛАКО



**З пачатку лістапада гэтага года малако ў Расіі рэзка падаражэла. Так, улетку літр малака каштаваў 7-9,5 рубля, а ў лістападзе — 11,3—12 рублёў.**

Цяперашні рост коштаў перавысіў звычайнае сезоннае падаражэнне на 10—15 працэнтаў, якое заўсёды адбываецца ў восеньска-зімовы перыяд. Самі вытворцы тлумачаць павелічэнне кошту сырога малака дэфіцытам сухога. Улетку перапрацоўшчыкі не скуплялі лішкі малака для сушкі, паколькі выраблёнае з сухога канцэнтрату малако па новым рэгламенце павінна звацца малочным напоем, які не карыстаецца попытам. Увосень кошты на сухое малако склалі 130—150 рублёў за кілаграм, узняўшыся ў параўнанні з мінулым годам амаль у тры разы (з 55 рублёў за кілаграм). Улетку расійскія малакавытворцы скардзіліся, што 99 працэнтаў гаспадарак спрацавалі са стратамі, у тым ліку з-за нізкіх закупачных цэнаў перапрацоўшчыкаў на сыравіну.

### У ШАТЛАНДЫІ ЗНОЎ ЗАГАВАРЫЛІ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Шатландскі ўрад апублікаваў «Белую кнігу» аб канстытуцыйнай будучыні краіны, адкрыўшы шлях да правядзення рэферэндуму аб незалежнасці ад Вялікабрытаніі. Гэта было зроблена ў дзень Святога Андрэя, заступніка Шатландыі.**

Кіраўнік урада і лідар Шатландскай нацыянальнай партыі Алекс Сэлманд заявіў, што Шатландыя павінна здабыць незалежнасць, каб цалкам рэалізаваць свой эканамічны патэнцыял. Ён таксама выказаў шэраг іншых варыянтаў, уключаючы ўводзіны новых істотных паўнамоцтваў для парламента Шатландыі, аднак незалежнасць з'яўляецца найлепшым варыянтам, адзначаецца ў паведамленні. «Прыйшоў час народа сказаць сваё слова аб будучыні Шатландыі», — заявіў Сэлманд на ланчы ў Эдынбургзе. Тым часам эксперты адзначаюць, што сфарміраваны партыяй Сэлманда ўрад не мае дастатковай падтрымкі апазіцыйных партый, каб правесці рэферэндум у 2010 годзе.



## Пацярпелы ў крушэнні «Неўскага экспрэса» беларус шпіталізаваны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нагадаем, што бяда здарылася ў мінулую пятніцу каля паловы на дзясятую вечара па маскоўскім часе: на 284-м кіламетры Акцябрскай чыгункі на перагоне Алешынка—Углоўка з рэек сышлі два апошнія вагоны пасажырскага цягніка № 166 «Неўскі экспрэс», які рухаўся з Масквы ў Санкт-Пецярбург. Згодна з асноўнай версіяй расійскіх праваахоўных органаў, прычынай крушэння стаў падрыў нявызначанага выбуховага прыстасавання, магутнасць якога склала каля сямі кілаграмаў у тратылавым эквіваленце. Як вынікае з папярэдняй інфармацыі, цяпер следчыя правяраюць, ці маюць дачыненне да тэракту ўдзельнікі незаконных узброеных фарміраванняў: першы раз «Неўскі экспрэс» быў атакаваны ў 2007 годзе і, паводле меркавання следства, зроблена гэта было па загадзе Доку Умарава. Між іншым, згадваецца, што абодва здарэнні, мінулае і цяперашняе, падобныя па выкананні: цягнікі былі ўзарваныя ў Наўгародскай вобласці, месцы здарэнняў знаходзяцца на адлегласці 100 кіламетраў адзін ад аднаго. Акрамя таго, у абодвух выпадках выбуховае прыстасаванне закладвалася на чыгунцы. У аддзяленні міліцыі разасланы фотаробат аднаго з падазроных.

Паводле ўчарашніх звестак, у гэтай аварыі загінулі 27 пасажыраў «Неўскага экспрэса» — у панядзелак стала вядома аб смерці ў бальніцы адной з пацярпелых, а на месцы трагедыі было знойдзена яшчэ адно цела загінулага. Дарэчы, сярод загінулых — некалькі высокапастаўленых расійскіх чыноўнікаў, у прыватнасці, кіраўнік Расрэзерва Барыс Еўстрацікаў і старшыня праўлення Расаўтадора Сяргей Тарасаў. З месца інцыдэнту былі шпіталізаваныя 92 чалавекі, а ўсяго ў «Неўскім экспрэсе» знаходзілася каля 650 пасажыраў.

Беларус, удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі МЗС, трапіў пасля крушэння ў бальніцу з траўмай сярэдняй ступені цяжкасці.

Між тым, учора раніцай у Дагестане чарговы інцыдэнт — перад пасажырскім цягніком Цюмень—Баку падарванае чыгуначнае палатно. Пасажырскі састаў не сышоў з рэек, але электрацягнік працягнуў вагоны па пашкоджаным участку яшчэ каля 150 метраў. На шчасце, у гэтым здарэнні няма ахвяраў і пацярпелых, пачатае расследаванне і па гэтым факце.

**Ігар ГРЫШЫН.**


г. ВИТЕБСК 17.12.2009

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 3. | Здание магазина с тремя пристройками, дорожкой, забором и сетями, расположенное по адресу: Витебская область, г. Миоры, ул. Садовая, 1, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости:<br>- капитальное строение с инв. № 211/С-8297 (здание магазина с тремя пристройками, дорожкой и забором) – кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша – шиферная, общая площадь 136,6 кв.м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9123 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (хозбытовая канализационная сеть) – протяженностью 1,1 м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9124 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения (водопроводная сеть) – протяженностью 12,0 м;<br>- капитальное строение с инв. № 254/С-9125 (сооружение специализированное энергетики (электрическая сеть) – протяженностью 15,0 м.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223350100001000309, площадью 0,0216 га, под здание магазина с офисом, сроком аренды 50 лет. Использование – под объект розничной торговли. | 85395402 | 8539540 |
| **С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ** | | | | |
| 4. | Здание караульного помещения, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/6, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-30742, одноэтажное кирпичное здание 1956 года постройки, общей площадью 165 кв.м, фундамент – бетонный, перегородки – кирпичные, перекрытия – деревянные, крыша – рубероидная.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003420, площадью 0,0453 га для обслуживания здания караульного помещения, сроком аренды 50 лет. | 54595 | 5459 |
| 5. | Здание контрольно-пропускного пункта, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-20265, одноэтажное кирпичное здание 1980 года постройки, общей площадью 8 кв.м, фундамент – бетонный, перекрытия – ж/бетонные, крыша – совмещенная.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003416, площадью 0,0034 га для обслуживания здания контрольно-пропускного пункта, сроком аренды 50 лет. Ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 В. | 36471 | 3647 |
| 6. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 1), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/9, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29287, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003418, площадью 0,0270 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 1, сроком аренды 50 лет. | 46679 | 4667 |
| 7. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 2), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/8, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29288, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003417, площадью 0,0238 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 2, сроком аренды 50 лет. | 45295 | 4529 |
| 8. | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (пожарный водоем № 3), расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, п/о Зубревичи, 1,3 км юго-западнее д. Дубровка, 1/10, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инвентарный номер 240/С-29289, объемом 100 куб.м, подземное цилиндрическое.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003419, площадью 0,0212 га для обслуживания сооружения пожарного водоема № 3, сроком аренды 50 лет. | 44170 | 4417 |
| **СО СНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ НА 20 %** | | | | |
| 9. | Капитальное строение с инв. № 240/С-28970 (здание ремонтной мастерской) с забором, тремя покрытиями площадок и капитальное строение с инв. № 240/С-27127 (сооружение специализированное энергетики), расположенные по адресу: Витебская область, Оршанский район, дер. Юрцево, и на право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости:<br>- здание ремонтной мастерской – одноэтажное, стены – металлические панели, общая площадь 657 кв.м, 1996 г. постройки, крыша – металлические панели, полы бетонные, электроосвещение – открытая проводка;<br>- забор дощатый решетчатый, ж/б столбы, площадью – 918 кв.м;<br>- покрытие площадки - черное щебенчатое для хранения навесного дорожно-строительного оборудования – 150 кв.м;<br>- покрытие площадки – черное щебеночное для стоянки дорожно-строительной техники – 2665 кв.м;<br>- покрытие площадки – черное щебеночное – подъезда к площадке для стоянки техники – 290 кв.м;<br>- воздушная линия электропередач на железобетонных опорах – 0,4 В, протяженность – 667,98 м.<br>Земельный участок с кадастровым номером 223684408101000119, площадью 1,2518 га для размещения объектов производственного назначения, сроком аренды 50 лет. Ограничения: расположение участка в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Скупья и охранной зоне тепловой сети. Назначение: для производственного назначения (склад, либо здание для ремонта и обслуживания автотранспорта). | 228860704 | 22886070 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk @tut.by.**

1. Аукцион состоится **17 декабря 2009 г. в 15 часов** в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 16.12.2009 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 17.12.2009 с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения райисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллиона рублей по каждому лоту, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Подробная информация об условиях аукциона, порядке участия и проведения аукциона опубликована ранее в газете «Звязда» от 22.04.2009 № 75 (26433), от 17.09.2009 № 175 (26533), от 23.10.2009 № 201 (26559).

# Кожны трэці асуджаны да папраўчых работ ухіляецца ад іх

**Найбольшая колькасць ухіленняў ад пакаранняў, не звязаных з пазбаўленнем волі, прыходзіцца на папраўчыя работы і абмежаванне волі. Пра гэта заявіў Аляксей СТУК, намеснік Генеральнага пракурора.**

Кожны трэці-чацвёрты асуджаны да папраўчых работ ухіляецца ад іх. Ад пакарання з накіраваннем у папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу ўхіляецца кожны пяты, а без накіравання — практычна кожны сёмы-восьмы асуджаны. Праблема ўхілення ад штрафу, грамадскіх прац і абмежавання займаць пэўную пасаду, па словах Аляксея Стука, не стаіць. Як правіла, гэта не такі вялікі працэнт ва ўдзельнай колькасці вынясення прысудаў, не звязаных з пазбаўленнем волі.

Прычына ўхіленняў, па меркаванні пракуратуры, — недастатковы кантроль за паводзінамі асуджаных з боку адміністрацыі папраўчай установы. А па месцы жыхарства і працы — недапрацоўка крымінальна-выканаўчай інспекцыі, неналежная прафілактычная праца ўчастковых інспектараў і інш.

— Вырашэнне праблемы мы бачым перш за ўсё ў індывідуалізацыі пакаранняў, — кажа Аляксей Стук, — Пракуроры і суддзі могуць спрагназаваць магчымасць ухіленняў. Гэта, вядома ж, больш бачна пракурору, суддзі і іншым удзельнікам працэсу. Але калі хранічных алкаголікаў, асобаў, якія страцілі ўсякую матывацыю да працы, прыгаворваюць да абмежавання волі ці прымусовых прац, то з нейкай доляй упэўненасці можна прагназаваць, што гэты від пакарання менавіта гэтыя людзі адбываць не будуць. Мы таксама хочам перавесці пакаранне за факты, якія сведчаць пра нядобрасумленнае адбыццё тэрміну, у разрад адміністрацыйных. Напрыклад, парушыў чалавек — арыштавалі. Ён адбыў арышт, вярнуўся і працягнуў адбываць асноўнае пакаранне. Прычым тэрмін арышту не павінен уключацца ў асноўны тэрмін.

Генпракуратура прапанавала дэкрыміналізаваць некаторыя артыкулы Крымінальнага кодэкса, звязаныя з ухіленнем адбыцця пакаранняў у выглядзе абмежавання волі, папраўчых работ і штрафаў. Для таго, каб суд мог накіроўваць хранічных алкаголікаў у месцы абмежавання волі і яны змаглі праходзіць лячэнне на «хіміі», генпракуратура прапанавала стварыць на базе некаторых установаў наркалагічныя службы.

Па словах Аляксея Стука, упершыню за апошнія 10—15 гадоў пазбаўленне волі перастала займаць першае месца сярод відаў пакарання. Па выніках 2008 года 22 працэнты ад агульнай колькасці прысудаў былі звязаны з пазбаўленнем волі, а 26 працэнтаў — з абмежаваннем. Сёлета тэндэнцыя захавалася.

**Настасся ЗАНЬКО.**

КХЛ

# ПіцерСКАя нумералогія

**СВОЙ чарговы, ужо трэці ў гэтым сезоне, паядынак супраць «армейцаў» з паўночнай сталіцы Расіі мінскае «Дынама» прайграла. Але ўсе, хто быў у суботу на трыбунах Палаца спорту ці сачыў за трансляцыяй па тэлебачанні, павінны пагадзіцца: беларуская каманда ніяк не заслугоўвае дрэнных ацэнак. Наогул, гульня атрымалася цікавай не толькі для спартыўных заўзятараў. Вялікі плён для разваг атрымалі, напэўна, прыхільнікі нумералогіі і розных неверагодных рэчаў, звязаных з лічбамі.**

**1/2.** У суботу «зубры» правялі свой 28 матч. Гэта роўна палова ад усёй турнірнай дыстанцыі рэгулярнага чэмпіянату. Пакуль у нас 9-е месца ў Заходняй канферэнцыі. Да «заліковага», восьмага, адставанне ў 5 балаў. Нагадаю, менавіта гэтая пазіцыя дае апошні пропуск у плэй-оф. Пакуль яго гаспадаром з'яўляецца «Тарпеда» з Ніжняга Ноўгарада.

**12:12.** На гэтых лічбах прыпыніўся таймер у сярэдзіне першага перыяду, калі Андрэй Міхалёў як сапраўдны гарналыжнік абышоў перашкоды ў выглядзе чатырох хакеістаў СКА і аддаў галявую перадачу Стасю. Той проста не меў маральнага права сапсаваць прыгажосць эпізоду. Па добрай традыцыі мінчане адкрылі лік.

**11:11.** Не менш прыгожыя сімвалы на табло падчас другога перыяду падабралі і піцерцы. Асэнсоўваючы ўзровень майстэрства Бута, можна нават з невялічкай доляй чорнага гумару выказаць меркаванне, што ён спецыяльна падбіраў той час, калі трэба моцным кідком адправіць у верхні, левы ад Мезіна, вугал варотаў шайбу.

**299.** Максіма Сушынскага цяжка чымсьці здзівіць. За сваю кар'еру расійскі форвард пабачыў, здаецца, усё ў хакеі. Ён ведае, куды, як і калі запусціць шайбу, каб яна апынулася за спінай галкіпера супернікаў. У суботу яго гол, павялічыўшы адрыў гасцей, стаў для «СУ-33» 299-м на найвышэйшым расійскім узроўні. І адкладваць юбілей надоўга Максім дакладна не збіраецца.



Фота БЕЛТА.

**8.** Калі на апошніх хвілінах каманда саступае з мінімальнай розніцай, натуральна, узнікае жаданне абавязкова адыграцца, зраўняць лік. У хакеі для гэтага ёсць такі дзейсны спосаб, як замена варатара на шостага палявога гульца. Часта карыстаецца гэтым і наша каманда: што пры Хэнлане, што пры Андрыеўскім. Але тым самым усё больш дапамагаем супернікам павялічыць свой бамбардзірскі рахунак. Суботняя шайба ў пустыя вароты стала восьмай такога кшталту.

Калі ж без лічбаў, то хочацца адзначыць прывабны факт. Адправіўшы Маканена ў фарм, пакідаючы па незразумелых прычынах каторую гульню запар па-за межамі пляцоўкі Хювенена, падняўшы ў асноўны склад маладых Дзямкова і Развадоўскага, Аляксандр Андрыеўскі ішоў, ды і ідзе далей, на вялікую рызыку. Адказваць, калі што, менавіта яму. І вельмі прыемна чуць каментарыі спецыялістаў аб тым, што нарэшце ў каманды пачаў з'яўляцца свой почырк, свой стыль. Хакеісты ўсё больш пачынаюць гуляць у так званы «савецкі», камбінацыйны хакей. І гэта разам з, безумоўна, паляпшэннем вынікаў не можа не падабацца заўзятарам.

**Яўген ВАРАКСА.**

Футбол

## Супраць Штанге ўсяго трое

**Выканкам беларускай федэрацыі футбола, які адбыўся ў мінулую суботу, пацвердзіў тое, чаго чакалі даўно: Бернд Штанге застаецца кіраваць нацыянальнай зборнай на наступныя два гады.**

Намеснік старшыні АБФФ Міхаіл Вергеенка нагадаў прысутным, што ў адборачным цыкле зборная пад кіраўніцтвам Штанге заняла 4-е месца. У той жа час старшыня АБФФ Генадзь Нявыглас паведаміў, што кіраўніцтва футбольнай федэрацыі вырашыла працягнуць супрацоўніцтва з вопытным нямецкім спецыялістам. Выканкам большасцю галасоў прагаласаваў за 61-гадовага Штанге. Супраць былі ўсяго трое членаў выканкама — старшыня праўлення ФК БАТЭ Анатоль Капскі, старшыня назіральнага савета ФК «Дынама» (Мінск) Юрый Чыж і галоўны трэнер брэсцкага «Дынама» Юрый Пунтус. Плануецца, што дапамагаць Бернду Штанге ў наступнай кваліфікацыі будуць беларускія трэнеры. Хто гэта будзе, вырашыцца ў студзені 2010-га на пасяджэнні выканкама АБФФ. Жараб'ёўка да адборачнага турніру Еўра-2012 адбудзецца 7 лютага 2010 года ў Варшаве.

У найбліжэйшы час кіраўніцтва АБФФ і Бернд Штанге абмяркуюць падрабязнасці новага кантракта. Пасля трэнер мае намер пайсці ў адпачынак, адкуль вернецца ў Беларусь 8 студзеня. Да лютаўскай жараб'ёўкі галоўны трэнер мае намер выпрацаваць новую канцэпцыю нашай зборнай.

## Лепшы футбаліст-2009 — Кульчы

**36-гадовы паўабаронца нацыянальнай зборнай і расійскага клуба «Растоў» Аляксандр Кульчы прызнаны лепшым футбалістам Беларусі. У суботу на пасяджэнні выканкама АБФФ былі зацверджаны імёны лаўрэатаў гэтага сезона.**

Лепшым гульцом 19-га нацыянальнага першынства стаў 23-гадовы паўабаронца БАТЭ Сяргей Крывец. Яго аднаклубнікі прызнаны лепшымі яшчэ ў трох намінацыях: лепшы варатар — Сяргей Верамко, лепшы абаронца — Ігар Шытаў, лепшы паўабаронца — Дзмітрый Ліхтаровіч. Лепшым форвардам стаў нападаючы «Гомеля» Каліжуры Майкон. Ён жа апярэдзіў усіх і ў спрэчцы бамбардзіраў, для чаго хапіла 15 мячоў. Лепшым трэнерам названы Віктар Ганчарэнка, які прывёў БАТЭ да шостага чэмпіёнства.

Барысаўскі чэмпіён перамог і яшчэ ў дзвюх намінацыях: «Двума складамі» — акрамя асноўнага, дублюючы склад апярэдзіў супернікаў. Прыз «Глядацкіх сімпатый» БАТЭ атрымаў за найвышэйшую наведвальнасць — матчы чэмпіёна наведала 117 890 балельшчыкаў.

У намінацыі «За волю да перамогі» прыз дастаўся магілёўскаму «Дняпру», «Пагрозай аўтарытэтаў» названы мікашэвіцкі «Граніт», прыз «Справядлівай гульні» — у ФК «Мінск».

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПАЛЕМІЧНАЯ ЗГОДА

Заканатворчая кухня можа спрацоўваць вельмі аператыўна і прапаноўваць «экспрэс»-стравы, калі размова ідзе пра топавыя пытанні. Да іх шэрагу, без сумненняў, аднасіцца выбарчае заканадаўства. Падчас абмеркавання прыблізна кожны дзясяты дэпутат націснуў кнопку «пытанне» за сваім працоўным месцам — нябачаны дагэтуль інтарэс. Пры гэтым большасць агучаных пытанняў, заўваг і прапаноў, на дзіва, датычыліся не далейшага паглыблення заяўленай лібералізацыі выбарчых працэсаў, а наадварот — узмацнення жорсткасці нормаў. Дэпутаты прапаноўвалі больш строга быць з адказнасцю кандыдатаў на выбарныя пасады, з іх вылучэннем, дэкларацыямі, фарміраваннем асабістых фондаў на агітацыю і гэтак далей. Аднак абсалютна ўсе прысутныя ў Авальнай зале дэпутаты (а гэта 104 народныя абраннікі) падтрымалі праект закона ў першым чытанні.

Пры разглядзе законапраекта прысутнічаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ, з дакладам у Авальнай зале выступіла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА. Яна назвала гэту аўдыторыю самай падрыхтаванай да ўспрыняцця законапраекта:

— Кожны з вас — шмат разоў выбаршчык, хоць бы раз — кандыдат, і большасць — гэта высокапрафесійныя арганізатары выбараў, якія плячом да пляча працавалі шмат гадоў з ЦВК, забяспечваючы арганізацыю выбараў на тэрыторыі сваіх рэгіёнаў (сапраўды, у цяперашнім дэпутацкім корпусе вельмі шмат прадстаўнікоў мясцовай вертыкалі. — **Аўт.**), мяркую, вы ў поўнай меры ацэніце тыя намаганні і тыя навелы, якія ўносіць кіраўнік дзяржавы на ваш разгляд і якія, безумоўна, будуць садзейнічаць, на мой погляд, паляпшэнню нашага выбарчага заканадаўства. Вядома ж, можна гаварыць пра дэмакратызацыю, лібералізацыю — гэта ўсё прысутнічае, аднак я абазначыла б тры галоўныя рысы, якія характарызуюць гэты законапраект. Узмацненне грамадскага кантролю, палягчэнне спосабу вылучэння і ўдзелу ў выбарах для кандыдатаў на выбарныя пасады і палітычных партый, узмацненне нагрузкі на ўсе выбарчыя камісіі, уключаючы Цэнтральную. Тым не менш усе гэтыя намаганні таго вартыя, бо яны ў многім будуць садзейнічаць, на наш погляд, узмацненню грамадскага даверу да правядзення выбараў і вынікам кожнай выбарчай кампаніі.

Мы досыць падрабязна знаёмілі вас, чытачы, з новаўвядзеннямі, таму сёння засяродзімся на тых момантах, што выклікалі інтарэс і палемічныя заўвагі ў дэпутатаў. Народныя абраннікі турбаваліся, ці не паставіць кандыдатаў у няроўныя ўмовы магчымасць ствараць асабістыя фонды. Дзякуючы гэтаму, калі б выбары праводзіліся цяпер, кандыдат у прэзідэнты мог бы распараздзіцца 105 млн беларускіх рублёў (у дадатак да тых 80,5 млн, што вылучыла б яму дзяржава), а кандыдат у дэпутаты — 35 млн рублёў (апроч дадзеных дзяржавай 1,75 млн). Пры гэтым сродкі, скіраваныя ў фонд, не абкладаюцца падаткам.

— Я думаю, што яны (кандыдаты. — **Аўт.**) і цяпер не заўсёды роўныя, таму што ў кожнага кандыдата, як у кожнага грамадзяніна, абсалютна розныя магчымасці для ўдзелу і зусім розная падтрымка, — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Яна нагадала таксама, што дзяржавай вылучаюцца кандыдатам сродкі на выраб друкаванай агітацыйнай прадукцыі, даецца магчымасць выступленняў па тэлебачанні і радыё. І для параўнання прывяла расцэнкі: так, на 105 млн рублёў (максімальны памер асабістага фонду кандыдата ў прэзідэнты) «на Першым Нацыянальным тэлеканале можна набыць ажно 11 хвілін, а мы кожнаму кандыдату ў прэзідэнты на апошніх выбарах давалі па гадзіне гэтага часу, таму дзяржава, нават даючы магчымасці для дадатковага фінансавання, вылучае нашмат больш».

Непакоіла дэпутатаў, што перавлічваць грошы ў асабістыя фонды могуць прыватныя асобы, маўляў, праз гэты канал вылучаць сродкі зможа хто заўгодна. Яны выказваліся аб тым, што гэта велізарная ніша для злоўжыванняў. Паводле меркавання Лідзіі Ярмошынай, наадварот, падобнай легалізацыяй дадатковых фінансавых сродкаў будзе створаны шлях да празрыстасці.

— Ну мы ж не можам павярнуць час назад. Калі ўвесь свет выкарыстоўвае дадатковыя прыцягнутыя сродкі і даўно іх легалізаваў, нам нельга рабіць выгляд, што мы існуем ва ўмовах камунізму.

Магчымасць стварэння асабістых фондаў кандыдатаў на выбарныя пасады зачапіла за жывое многіх дэпутатаў, турбаваліся нават пра тое, што хтосьці стане набываць аўто са сродкаў фонду, маўляў, не ўсе кандыдаты — сумленныя людзі, цікавіліся дэталямі стварэння і расходавання фондаў. Адказваючы на пытанні, спадарыня Ярмошына падкрэсліла, што ўсе нюансы будуць прапісаныя ў асобным палажэнні, якое будзе зацвярджацца ЦВК сумесна з Беларусбанкам. Яна адзначыла таксама, што, напрыклад, пасля рашэння аб адмене рэгістрацыі кандыдата сродкі з яго асабістага фонду будуць залічаныя ў бюджэт.

У гутарцы з журналістамі Лідзія Ярмошына не выключыла, што памеры фондаў з цягам часу будуць павялічвацца. «Чаму мы вызначылі такія памеры? Ды таму што ніхто не ведае, якімі яны павінны быць. Зрабіць занадта вялікімі — заведама заявіць, што выбары толькі для багатых. Бедныя не павінны ўдзельнічаць, багатыя «задушаць» усіх сваёй рэкламай. Мы спрабуем злучыць дзве фантастычныя рэчы — стварыць больш яркія магчымасці для перадвыбарнай агітацыі і захаваць роўнасць усіх».

Шмат пытанняў у Авальнай зале датычылася і нормы аб дэклараванні прыбыткаў кандыдатаў і іх сваякоў. Паводле новаўвядзенняў, дапускаецца нязначнае скажэнне інфармацыі ў дэкларацыі.

— Ёсць такія неадпаведнасці, якія носяць неістотны характар, — тлумачыць Лідзія Ярмошына. — Ёсць чэкі «Маёмасць», пра якія забыў ужо амаль кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь. А калі кандыдаты ў дэпутаты забывалі згадаць гэтыя чэкі ці акцыі прадпрыемства, якія з моманту іх набыцця ні разу ў жыцці не прынеслі ім ні капейкі прыбытку, ці не ўказалі, што кватэра, якая лічыцца на жонцы, знаходзіцца ў долевай уласнасці, хоць долі былі не вылучаныя, калі атрыманая пенсія не адпавядае на дзве тысячы рублёў той даведцы, што выдала падатковая інспекцыя, гэта з'яўлялася падставай для адмовы ў рэгістрацыі. Дык вось мы лічым, што гэта неістотна і не можа служыць падставай для адмовы ў рэгістрацыі.

Яна выказала меркаванне, што калі будзе распрацоўвацца асобнае палажэнне, то зыходзіць будуць з працэнтных суадносінаў сумы (або каштоўнасці), якая не была ўзгаданая, і, напрыклад, гадавога даходу грамадзяніна. Паколькі трэба, каб пакаранне было адэкватным здзейсненаму. Варта размяжоўваць таксама наўмысныя дзеянні і памылковыя.

Закідвалі дэпутаты вуду і наконт кандыдацкага закладу. Ну скажам, унёс 300 тыс. долараў пад заклад — і можаш не збіраць подпісы, не вылучацца ад партыі. Пры ўмове, што кандыдат не будзе абраны, грошы пойдуць у бюджэт.

— Я заўжды была прыхільніцай гэтай ідэі, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Прынамсі гэта адсее несур'ёзных кандыдатаў у дэпутаты. Што ўжо казаць, ёсць у нас катэгорыя людзей, якая ўдзельнічае ў выбарах дзеля ўдзелу і ў якіх няма аніякіх гарантый і перспектыў нават набраць некалькі працэнтаў галасоў выбаршчыкаў. Аднак яны ідуць, каб засвяціцца. І гэта ў пэўным плане дыскрэдытуе ідэю выбараў.

На думку Лідзіі Ярмошынай, выбарчы заклад патрэбны, і варта, каб ён быў агульным: «дзяржава не можа легалізаваць прыцягненне да выбараў замежных інвестыцый, таму што гэта ўжо пытанне суверэнітэта дзяржавы».

Аднак дазвол унесці грошы, не збіраючы подпісы, паводле меркавання старшыні Цэнтральнай камісіі, не будзе наогул выкарыстоўвацца, таму што збор подпісаў — гэта добрая магчымасць «разрэкламавацца». І ў прапанаваных папраўках такой нормы няма.

Вельмі слушную прапанову выказаў дэпутат Генадзь Давыдзька — зрабіць удзел у дэбатах абавязковым для кандыдатаў. На яго думку, «менавіта ў дэбатах бачны будучы палітык, бачна яго сапраўднае аблічча».

На думку ж старшыні Цэнтрвыбаркама, гэта «той фармат перадачы, дзе людзі знаходзяцца ў розных умовах, і найбольш нявыгадныя ўмовы будуць перш за ўсё для вас — дзейнага дэпутата. Усе дэбаты звядуцца да крытыкі вас як дэпутата. Гэта павінна быць абавязкова добраахвотным: і калі службовая асоба ідзе на ўдзел у дэбатах, то яна павінна ведаць, што яе чакае».

Запытаўся спадар Давыдзька і пра тое, што «хвалюе большасць простых выбаршчыкаў» — шкляныя скрыні для бюлетэняў і магчымасць усталявання відэакамеры над сталом, дзе ідзе падлік галасоў.

— Мы ж з вамі не ў Японіі жывём, трэба рэальна глядзець — якія відэакамеры ў сельскім Савеце ці ў клубе! — сказала Лідзія Ярмошына. — Дай Божа, каб нармальна ўсё абсталявана было, каб грошай на шыльду хапіла. А шкляныя скрыні для галасавання ніхто не забараняе, мы проста не прапісваем, якія яны павінны быць. Мы вызначаем іх памеры, кажам, што яны павінны апячатвацца. Той, у каго ёсць грошы, няхай робіць пластмасавыя. І, дарэчы, робяць. У нас цэлыя раёны ў Брэсцкай вобласці маюць такія скрыні. Тыя, у каго грошай няма, — школы напрыклад, яны саб'юць гэту скрыню з дошак, і яна таксама будзе прыдатнай. Усё залежыць ад тых сродкаў, якія маюцца ў арганізацыі, што ўтварае выбарчы ўчастак. Калі прад'явіць такое патрабаванне ў агульнарэспубліканскім маштабе, тады трэба адкрытым тэкстам сказаць — мы павінны значна павялічыць колькасць сродкаў, якія вылучаюцца на выбары. Таму што кожная скрыня каштуе не менш за 100 долараў, а іх павінна быць пяць на кожным участку — адна для асноўнага дня, адна для датэрміновага галасавання і тры пераносныя. І хто за гэта будзе адказваць, хто будзе захоўваць? Таму што, глядзіш, да наступнай выбарчай кампаніі ў гэтай скрыні і агуркі будуць квасіць — не выключана, калі яны не будуць спецыяльна захоўвацца. Таму тут ёсць пытанні.

Дэпутат Ігар Карпенка, другі сакратар ЦК КПБ, выступіў супраць увядзення нормы, якая дазваляе партыі вылучаць сваіх кандыдатаў і па тых акругах, дзе няма яе нізавых структур. «Можа, партыям час ісці ў народ?» — зазначыў палітык. Ён дадаў, што ў Камуністычнай партыі Беларусі «практычна ва ўсіх акругах ёсць свае партыйныя ячэйкі, і для нас не складае працы вылучаць там кандыдатаў».

Старшыня Цэнтральнай камісіі адзначыла, што партый становіцца менш (з 18 засталося 15), як і саміх партыйцаў — сярод кандыдатаў на выбарныя пасады. Іх трэба падтрымліваць. Так, партыі часам «спекулююць» і кажуць замежным эмісарам, што «ўлада поўнасцю ім перашкаджае, я і ячэйку не магу ўтварыць на тэрыторыі выбарчай акругі, таму і ў выбарах не ўдзельнічаю», — заўважыла кіраўнік ЦВК. Пасля ўвядзення ў сілу паправак, на думку Лідзіі Ярмошынай, замежныя эмісары змогуць спытаць у партыйцаў «дзяржава ж дала магчымасць удзельнічаць у выбарах па любой выбарчай акрузе, чаму вы не скарысталіся».

Былі ў дэпутатаў нават прапановы змяніць выбарчую сістэму.

— Магчымасць абрання па партыйных спісах сапраўды стымулюе развіццё партый, павелічэнне партыйных шэрагаў. Нішто так шкодна не ўплывае на развіццё нечага, як адсутнасць надзеі. Калі ж яны ідуць па мажарытарных выбарчых акругах, у партый вельмі мала надзеі на абранне. Мажарытарная сістэма заўжды садзейнічае абранню таго, за кім стаіць большасць, не ўлічвае інтарэсы ўсяго спектра палітычных меркаванняў. Аднак без змянення Канстытуцыі мы не можам змяніць нашу выбарчую сістэму. У нас ёсць інстытут водзыву дэпутата — калі ён не апраўдаў даверу выбаршчыкаў, паводле ініцыятывы не менш чым 20 працэнтаў выбаршчыкаў акругі. Як можна адазваць дэпутата, абранага па партыйным спісе? Адазваны можа быць толькі мажарытарый. Думаю, калі-небудзь мы ўсё ж будзем змяняць сваю выбарчую сістэму, ці магчыма, мажарытарная ў нас будзе прыстасаваная перш за ўсё пад інтарэсы палітычных партый так, як гэта існуе ў ЗША, дзе мажарытарная сістэма і пры гэтым з вельмі моцным партыйным духам. Цалкам верагодна, што нам таксама неабходна ствараць у ідэале нешта такое, моцнае, двухпартыйнае. Аднак гэта справа будучыні, а наогул я з'яўляюся прыхільніцай гэтай ідэі.

Прыблізна на 85—90 працэнтаў новаўвядзенні ўлічваюць рэкамендацыі АБСЕ, а некаторыя прапановы былі не толькі цалкам здаволеныя, але нават і перасягнутыя, — адзначае старшыня ЦВК. Аднак, паводле яе меркавання, выказанага ў гутарцы з журналістамі, «цалкам верагодна, што адносіны Захада перш за ўсё вызначаюцца тым, каго мы выберам падчас гэтых выбарчых кампаній»...

**Ала МАЧАЛАВА.**

## СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Агат - Систем» (УП «Агат - Систем»), Государственный военно-промышленный комитет | Республиканское автотранспортное унитарное предприятие «Минскагротранс» (УП «Минскагротранс»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Научно-производственное республиканское дочернее унитарное предприятие «Ремид» (УП «Ремид»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Дорожно-строительный трест № 7» (РУП «ДСТ № 7»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Проектно-производственное республиканское унитарное предприятие «Институт Белгипроагропищепром» (УП «Институт Белгипроагропищепром»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Комплектующее оптово-торговое республиканское унитарное предприятие «Стройкомплект» (РУП «Стройкомплект»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 220141, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 51 | 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 29 | 220038, г. Минск, ул. 1-ый Твердый пер., 6 | 220099, г. Минск, ул. Кижеватова, 8 | 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 1 | 220012, г. Минск, ул. Чернышевского, 10 а |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Научные исследования и разработки в области естественных и технических наук | Деятельность автомобильного грузового транспорта | Производство компрессоров, частей и принадлежностей автомобилей и их двигателей | Строительство и ремонт дорог | Научные исследования и разработки в области естественных и технических наук | Научные исследования и разработки в области естественных и технических наук |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 |
| Численность работающих, чел. | 336 | 449 | 65 | 602 | 319 | 30 |
| Срок предъявлений претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб. | 9 288 400 000 | 9 998 665 600 | 2 153 426 000 | 28 052 556 400 | 2 520 584 000 | 3 017 863 200 |
| Стоимость основных фондов – всего, руб. | 6 053 808 155 | 28 248 758 307 | 720 910 547 | 28 217 942 098 | 810 136 863 | 1 758 598 479 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 4,6302 | 16,4703 | 0,353035 | 48,1915 | нет | 1,98245 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб. | Нет | 6 000 000 | нет | 340 750 | 5 660 000 | 2 953 750 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб. | Нет | нет | нет | нет | 13 281 839 | нет |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Балансовая прибыль | 1 814 276 519 | 495 554 610 | 243 604 793 | 2 652 000 000 | 1 283 901 487 | 248 628 673 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность кредиторская | 2 052 605 662 | 1 062 774 415 | 197 531 061 | 3 982 182 880 | 2 543 622 925 | 47 360 709 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность дебиторская | 206 532 268 | 2 284 304 094 | 158 607 460 | 1 648 967 248 | 173 224 518 | 106 176 363 |

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское унитарное предприятие «Оршанский авиаремонтный завод» (Государственное предприятие «Оршанский авиаремонтный завод»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Гомельское республиканское обувное унитарное предприятие «Труд» (ГРОУП «Труд»), Белорусский государственный концерн по производству и реализации товаров легкой промышленности | Республиканское сельскохозяйственное унитарное предприятие «Агрокомбинат «Южный» (РСУП «Агрокомбинат «Южный»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Рогачевская экспортно-сортировочная льнобаза» (РУПП «Рогачевская экспортно-сортировочная льнобаза»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Головное специальное конструкторско-технологическое бюро гидроаппаратуры с опытно-экспериментальным производством» (РУП «ГСКТБ ГА»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Полесьеэлектромаш» (РУП «Полесьеэлектромаш»), Министерство промышленности Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 211004, Витебская область, Оршанский район, г. п. Болбасово | 246022, г. Гомель, ул. Советская, 39 | 246049, Гомельская область, Гомельский район, п. Цегельня | 247672, Гомельская область, г. Рогачев, ул. Могилевская, 3 | 246629, г. Гомель, ул. Советская, 145 | 225644, Брестская область, г. Лунинец, ул. Красная, 179 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Выполнение ремонта авиационной техники, осуществление иных видов деятельности в области авиации | Производство обуви | Растениеводство, животноводство, производство мяса и мясопродуктов, молочных продуктов, готовых кормов для животных | Специализированная оптовая торговля товарами | Деятельность конструкторских организаций, осуществляющих экспериментальные разработки, производство научно-технической продукции, выполнение работ и оказание услуг научно-технического характера | Производство электродвигателей, генераторов и трансформаторов |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Занимает доминирующее положение |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества, 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества, 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| Численность работающих, чел. | 590 | 394 | 565 | 12 | 225 | 1 302 |
| Срок предъявлений претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб. | 14 879 484 400 | 9 079 400 000 | 50 566 199 200 | 190 172 400 | 6 851 948 400 | 32 263 739 200 |
| Стоимость основных фондов – всего, руб. | 16 948 021 136 | 9 037 227 650 | 45 073 820 193 | 222 635 296 | 6 021 671 771 | 24 343 705 614 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 335,9206 | 6,1 | 3 561 | 1,0424 | 0,5307 | 35,4402 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб. | нет | 1 507 541 315 | 947 392 167 | 600 000 | 1 198 095 | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб. | нет | нет | нет | нет | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Балансовая прибыль | - 3 091 611 915 | 452 505 598 | 4 444 349 417 | 24 367 767 | 757 159 510 | 5 906 377 085 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность кредиторская | 16 428 489 296 | 238 548 592 | 3 338 686 435 | 33 775 989 | 1 739 214 657 | 10 064 169 076 |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Задолженность дебиторская | 5 743 347 403 | 1 965 483 665 | 2 672 375 711 | 596 390 943 | 44 727 137 | 3 272 024 331 |

УНП 100745627.

# КАЛІ ЮЛЯ ВЫЙДЗЕ З ЦЕНІ?

*Права на рэпрадуктыўнае здароўе, якое дазваляе мець здаровых дзяцей, інтымныя адносіны і шчаслівую сям'ю, ёсць у кожнага чалавека. У ВІЧ-інфіцыраванай Юлі таксама*

**За апошнія 15 гадоў шмат што змянілася ў галіне рэпрадуктыўнага здароўя. Напрыклад, у 5 разоў знізілася колькасць абортаў. Даступнымі для моладзі сталі бясплатныя кансультацыі адкрытых ва ўсіх абласцях спецыяльных Цэнтраў дружалюбнага стаўлення да падлеткаў... Аднак не зніклі, на жаль, усё яшчэ недастатковая сэксуальная адукаванасць грамадства і яго нелаяльнае стаўленне да ВІЧ-інфіцыраваных людзей, гатовых ствараць сям'ю і нараджаць дзяцей... Яскравым пацвярджэннем жывучасці стэрэатыпаў з'яўляецца нежаданне маладой «становўчай» матулі раскрываць свой статус — называць прозвішча і паказваць на старонках газеты свой твар.**

— У цэлым урачы ставіліся да мяне нармальна, — узгадвае 24-гадовая Юля. — Але бывалі і непрыемныя сітуацыі. Гэта было крыўдна і балюча. Аднойчы прыйшла на прыём да стаматолага, ціха сказала медсястры аб сваім статусе. Мяне папрасілі паўтарыць гучней — я паўтарыла. Але медсястра зноў недачула. Давялося на ўвесь кабінет крычаць, што я — ВІЧ! Чаму б не даваць пацыентам магчымасць самім запаўняць картку?

Юлі не было і дваццаці, калі яна даведалася аб новым статусе.

— Пяць гадоў таму я пазнаёмілася з маладым чалавекам, — кажа яна. — Закахалася, пачалі сустракацца. Аднойчы быў неабаронены сэкс. Потым мы разышліся. Разрыў падаўся мне надта дзіўным, надзвычай раптоўным... Унутраны голас сказаў, што трэба абследавацца. Я здала аналізы, у тым ліку і на ВІЧ... Вынік шакіраваў мяне. Я ніколі не спрабавала наркотыкаў, не вяла бязладнае палавое жыццё...

Нечакана для сябе дзяўчына хутка супакоілася, сабралася з сіламі. Пачала шукаць інфармацыю. Урач-інфекцыяніст, у якога яна назіраецца, расказала, як неабходна засцерагацца. А ў хуткім часе Юля выйшла замуж — за хлопца, з якім вучылася ў інстытуце. Юля адразу расказала яму пра свой дыягназ. Хлопец сказаў, што кахае яе і жадае, каб яны былі разам, нягледзячы ні на што. Сама Юля цяпер кажа, што наўрад ці адважылася б на такі ўчынак... Дарэчы, сябры, якім дзяўчына «ўсё» расказала, таксама не адвярнуліся і нават падтрымалі ў рашэнні нараджаць.

— Я здала аналізы. У мяне была досыць малая канцэнтрацыя віруса ў крыві. Варыянт штучнага апладнення мы не разглядалі. Урач-інфекцыяніст пракансультаваў нас адносна нашых магчымасцяў, рызыкі, перспектывы, а таксама спрыяльных для зачацця дзён. Гінеколаг жа спачатку разгубілася, маўляў, што мне з табой рабіць?.. Але потым яе сумненні развеяліся. Хутка я зацяжарала. Арцём здаў аналізы на ВІЧ. Вынік быў адмоўным...

Паводле слоў спецыялістаў, парам, дзе адзін ці абодва партнёры — ВІЧ-інфіцыраваныя, можа прапаноўвацца магчымасць зачацця з дапамогай экстракарпаральнага апладнення. Што ж да зачацця звычайным шляхам у пары, дзе адзін з партнёраў не інфіцыраваны, то ім абавязкова павінна тлумачыцца верагоднасць заражэння пры неабароненых палавых кантактах.

З 28-га тыдня цяжарнасці і да самых родаў Юля праходзіла курс спецыяльнай тэрапіі, пастаянна знаходзілася пад кантролем акушэр-гінеколага і інфекцыяніста. Дзіцяці прызначалі лекавы сіроп і бісептол да 6-га месяца. Нарадзіўся Мішка з дапамогай кесарава сячэння. Пасля родаў Юля ляжала ў палаце разам са здаровымі маці.

— Урачы параілі не расказваць ім пра мой статус, паколькі да мяне адна дзяўчына адкрылася суседкам па палаце. Узнік скандал. Жанчыны патрабавалі, каб іх перавялі ў іншую палату. Я нічога пра сябе не сказала, аднак і не ведала, як выйсці з няёмкага становішча, калі матулі пачалі пытацца, чаму я не кармлю грудзямі...

Цяпер Мішутку — паўгода. Наяўнасць ці адсутнасць у яго ВІЧ-інфекцыі можна будзе вызначыць толькі па дасягненні 1,5 года. Юля спадзяецца на лепшае. Ва ўсякім выпадку, яна выконвала ўсе рэкамендацыі спецыялістаў — атрымлівала супрацьвірусную тэрапію, нараджала з дапамогай кесарава, адмовілася ад груднога выкормлівання. Такія меры дапамагаюць наблізіць рызыку перадачы віруса дзіцяці да 1-2 працэнтаў. Без прафілактычных мераў рызыка перадачы віруса нованароджанаму складае 20—45 працэнтаў. Прычым тут важна дадаць і яшчэ адну акалічнасць. Пытанне аб нараджэнні дзіцяці ўзнікае ў ВІЧ-інфіцыраванай жанчыны, як правіла, на этапе асімптомнага развіцця захворвання, калі яна добра сябе адчувае і ўтрыманне віруса ў яе крыві нізкае. У клінічнай жа стадыі, калі захворванне пачало развівацца, гаварыць аб дзетанараджэнні, кажуць спецыялісты, практычна не выпадае.

Паводле слоў **урача-інфекцыяніста аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІД Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ларысы КАСІНСКАЙ**, да 2002 года ў нас выкарыстоўвалі толькі адзін антырэтравірусны прэпарат — рэтравір. Да таго ж далёка не ўсе жанчыны мелі магчымасць атрымліваць хоць бы яго. Сёння ў Беларусі ёсць магчымасць прызначыць шматкампанентную высокаактыўную антырэтравірусную тэрапію.

«Інфіцыраваны чалавек, які дакладна выконвае ўсе рэкамендацыі ўрачоў, прымае неабходныя прэпараты, кантралюе ўзровень віруса ў крыві, мае магчымасць вырасціць здаровых дзяцей, — тлумачыць **галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксандр БАРСУКОЎ**. — У любой жаночай кансультацыі сёння могуць даць падрабязную кансультацыю адносна ВІЧ-інфекцыі і магчымага мацярынства. У Мінску яшчэ працуюць аддзелы прафілактыкі ВІЧ-СНІД пры гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя».

Калі не так даўно асноўнай прычынай узнікнення інфекцыі была наркаманія, то сёння ў большасці выпадкаў ВІЧ перадаецца праз неабаронены палавы кантакт. Інфіцыруюцца людзі, у якіх ёсць добрая адукацыя, вартая праца, сям'я. Зразумела, калі ў такога чалавека пацвярджаецца дыягназ ВІЧ-інфекцыя, гэта выклікае шок. Як паказвае практыка, шэраг людзей не могуць адразу адкрыцца сваім блізкім, а нават калі і адкрываюцца, то грунтоўнай падтрымкі і адказаў на свае пытанні ўсё адно чакаюць ад спецыялістаў, у тым ліку ад медперсаналу ў паліклініцы.

У момант асэнсавання свайго дыягназу Юля адчула, што амаль нічога не ведае пра злашчасны вірус. У рэшце рэшт дапамог урач-інфекцыяніст і... інтэрнэт.

Дарэчы, адсутнасць належных ведаў — праблема не толькі Юлі. Досыць частая сітуацыя для маладых людзей — немагчымасць абмеркаваць з самымі блізкімі людзьмі — бацькамі — пытанні сэксуальнага жыцця. Далёка не ўсім своечасова трапляецца ў рукі і спецыяльная літаратура. Ды і што такое надрукаваны тэкст супраць шчырай размовы з чалавекам, які мае пэўны жыццёвы досвед?

Тым не менш, калі пераадолець уласную лянату, то па інфармацыю аб кантрацэпцыі і захаванні сэксуальнага здароўя можна звярнуцца ў звычайную паліклініку па месцы жыхарства. Там жа або ў скурна-венералагічным дыспансэры можна прайсці абследаванне на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам.

У краіне адкрыты і 17 Цэнтраў здароўя моладзі, або Цэнтраў дружалюбнага стаўлення да падлеткаў. Іх спецыялісты могуць расказаць аб эфектыўнасці розных спосабаў кантрацэпцыі, магчымых наступствах неабароненага сэксу, зменах у арганізме, звязаных з цяжарнасцю, наступствах перарывання непажаданай цяжарнасці, адказнасці партнёраў адно перад адным і г.д.

...Колькасць людзей, якія жывуць з ВІЧ, будзе расці. Як і колькасць народжаных ад ВІЧ-маці дзяцей. Дарэчы, на сёння з пацверджаным дыягназам ВІЧ-інфекцыі ў Беларусі пражывае 140 дзяцей. Усе яны не могуць і не будуць жыць у ізаляцыі. А значыць, у наступныя, скажам, 15 гадоў грамадству давядзецца больш актыўна змагацца са сваімі стэрэатыпамі. Каб такія, як Юля, маглі называць сваё прозвішча і не хаваць твар.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## БОЯЗЬ АСУДЖЭННЯ

Толькі 40 працэнтаў людзей, якія жывуць з ВІЧ, выкарыстоўваюць з пастаянным партнёрам прэзерватыў. У зарэгістраваным шлюбе да такой меры засцярогі прыбягаюць каля 55 працэнтаў. Большасць людзей з ВІЧ-інфекцыяй не звяртаюцца па дапамогу да медыкаў, што абумоўлена ў першую чаргу бояззю выдавання дыягназу і асуджэння з боку медперсаналу. Пры гэтым палова лічыць доступ да спецыялізаванай медыцынскай дапамогі адным з найбольш важных фактараў для падтрымкі сэксуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя. Звесткі былі атрыманыя ў межах праекта «Паляпшэнне доступу людзей, якія жывуць з ВІЧ/СНІД, да інфармацыі і паслуг па рэпрадуктыўным здароўі». Праект рэалізуецца Фондам ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) пры падтрымцы Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІДзе (ЮНЕЙДС).

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

**14 декабря 2009 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Жабинковский сахарный завод», расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.**

Собрание пройдет по адресу:
г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления.

**Повестка дня собрания:**

**«О согласовании предоставления благотворительной (спонсорской) помощи».**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 4 декабря 2009 г. по 13 декабря 2009 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 14 декабря 2009 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 14 декабря 2009 года, 13.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 декабря 2009 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — **паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 200037600

## ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»

**СООБЩАЕТ, ЧТО 17 ДЕКАБРЯ 2009 ГОДА В 16.00 В АКТОВОМ ЗАЛЕ ПРЕДПРИЯТИЯ, РАСПОЛОЖЕННОГО ПО АДРЕСУ: ул. ПОНОМАРЕНКО, 43, СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**

1. Утверждение «Регламента работы с реестром акционеров ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Регистрация акционеров будет производиться в актовом зале предприятия с 15.00 до 15.45 часов.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – нотариально заверенную доверенность).

УНП 100258980

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | г. Барановичи, ул. Брестская, 282 |
| Продавец недвижимого имущества | Эксплуатационное республиканское унитарное предприятие «Опытная путевая машинная станция № 115» Белорусской железной дороги, тел.: 80163 49 27 75, 49 27 81 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание столовой 1982 г.п., 1-этажн., кирпичное, площадь – 386,3 кв.м. Земельный участок площадью 0,1131 га, под размещение объекта торговли, по оказанию услуг населению, административного, производственно-складского назначения, либо общественного питания, срок аренды – 50 лет с последующим продлением срока аренды |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 207 073 569 |
| Сумма задатка, руб. | 20 707 000 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения – по 18.12.2009 г. включительно |
| Организатор аукциона | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 20 87 85, 23 12 63, 23 44 06 www.brest-region.by** |

Аукцион состоится **21 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 17.10.2009 г. № 197.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 18 декабря 2009 года включительно.***

# ЯК БЕЛАРУСАЎ АДВУЧАЮЦЬ АД ГАРЭЛКІ?

**Карэспандэнт «Звязды» наведаў эксперыментальную вёску Мосар, дзе катэгарычна забаронена прадаваць алкаголь. Ці атрымалася такім чынам «закадзіраваць» выпівак і чаму на мясцовы «сухі закон» скардзяцца адзінокія мамы?**

Удзелаўскі сельсавет Глыбоцкага раёна ў жніўні гэтага года зрабілі эксперыментальнай «зонай цвярозасці». Парадкі навялі такія ж, як у Савецкім Саюзе часоў «сухога закону». Па задумцы, у крамах на тэрыторыі сельсавета забаранілі да Новага года прадаваць хоць якое-небудзь спіртное. Адпаведнае рашэнне прыняла мясцовая ўлада, а ініцыятар «сухога закону» — знакаміты мясцовы ксёндз Юзас Булька.

Прыязджаем у вёску Удзела з надзеяй упершыню ў жыцці пабачыць безалкагольную краму і спыняемся каля мясцовай «Мінуткі». Ды толькі на цвярозасць у краме і намёку няма — паліцы шчодра застаўленыя півам шасці гатункаў, гарэлкай, шампанскім і, вядома, танным пладова-ягадным вінам.

— *Едзьце ў Мосар, толькі там нічога няма, а ў нас усё ё*, — прамовіў мясцовы мужык Вася, з гонарам паказваючы на ўсю гэту алкагольную разнастайнасць.

Вася растлумачыў, як даехаць да Мосара, і расказаў, што для некаторых мосарскіх мужыкоў яго Удзела — амаль як Лас-Вегас. Бо што гэта за вёска, калі ў крамах няма гарэлкі і віна?!

Спыняемся ў Мосары ля мясцовага «Магазіна», таго самага, які некаторыя выпівакі і за краму не лічаць, бо на паліцах сапраўды няма ні «чарніла», ні гарэлкі, ні нават шампанскага. З актуальных прадуктаў толькі хлеб, печыва ды мыла з зубной пастай. Задаём прадавачцы Вользе Юр'еўне дзяжурныя пытанні: ці ганарыцца яна тым, што жыве ў такой безалкагольнай вёсцы, ці лепш зрабілася, калі Мосар стаў «зонай цвярозасці»?

— *Лепш то яно лепш*, — уздыхае Вольга Юр'еўна і так працягвае сваю думку: — *Толькі мужыкі, якія пілі, усё адно п'юць, у крамы суседніх вёсак бегаюць, як марафонцы. А ў мяне каса ледзь не ўдвая меншай зрабілася, а значыць — удвая зменшылася зарплата, бо яна залежыць ад плана. Маю каля 300 тысяч у месяц. А ў мяне дзіцёнак, як яго гадаваць на такія грошы? Дапамогі ад дзяржавы не атрымліваю. Нас, такіх баб адзінокіх, у Мосары хапае. І калі трэба якую працу зрабіць, мужыкі без 100 грамаў не пагаджаюцца. Вось і думайце, ці варта ладзіць такія эксперыменты? Вам, журналістам, усё адно — зайшоў, пустыя паліцы сфатаграфаваў — і да пабачэння...*

Прадавачка з другой безалкагольнай крамы Мосара таксама на чым свет стаіць наракала на «зону цвярозасці».

— *Выходзіць, што цяпер самы хадавы наш прадукт — хлеб*, — выступала прадавачка з панурай усмешкай. — *А ксяндза Бульку пасля гэтай ініцыятывы мае кліенты любяць адзін са ста.*

> **— Лепш то яно лепш, — уздыхае Вольга Юр'еўна і так працягвае сваю думку: — Толькі мужыкі, якія пілі, усё адно п'юць, у крамы суседніх вёсак бегаюць, як марафонцы.**

Старэйшыя жыхары вёскі расказалі карэспандэнту «Звязды», што пітушчых у Мосары насамрэч не так і шмат. А тыя, што жлукцяць, з увядзеннем «сухога закону» ўсё адно затарваюцца ў «самагоншчыкаў».

Выязджаем з Мосара, каб паглядзець на незвычайную вёску Парыж, якая стаіць непадалёк. Ці пусцілі антыалкагольныя тэндэнцыі свае карані тут? У Парыжы ксёндз Булька таксама правёў вялікую працу. Спачатку вярнуў вёсцы гістарычную назву (камуністы ў свой час перайменавалі населены пункт у Навадруцк), потым аднавіў мясцовы касцёл і збудаваў 30-метровую копію Эйфелевай вежы. Мясцовыя кабеты запэўнілі карэспандэнта «Звязды» ў тым, што духоўнае адраджэнне ў Парыжы ператварыла некаторых выпівак у прыстойных «парыжан».


На здымку адна з дзвюх унікальных мосарскіх крамаў, дзе забаронены продаж алкаголю.

Ды не ўсіх. Мясцовыя школьнікі Генрых, Арцём, Раман і Саша далі да мяне інфармацыю, што новая назва вёскі для некаторых жыхароў стала яшчэ і тлумачэннем — раз «парыжанін», трэба піць віно.

— *У нас некаторыя хочуць жыць, як сапраўдныя французы*, — прызнаюцца хлопцы. — *А французы ж п'юць віно. І нашы ўжываюць, ды не вінаграднае, а яблычнае...*

### ВЯСКОВАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ: «Нават выпівакі лішнюю капейку дадому нясуць»

Інтэлігенцыя Удзелаўскага сельсавета трымаецца думкі, што ідэя «зонаў цвярозасці» мала-памалу прыносіць плён.

— *Тры месяцы жывём тут без гарэлкі, і ніхто не памёр. Намнога спакайней зрабілася*, — даказвае Марыя Раманаўна Ткачонак, наглядчыца Мосарскага краязнаўчага музея. — *Атрымаюць зарплату, ідуць у краму, купляюць прадукты, а не спіртное. Глядзіш, выпівакі замест гарэлкі нешта іншае ў сям'ю нясуць. Часта здараецца так: захацеў мужык выпіць, а няма дзе ўзяць. І перастае да жонкі чапляцца: «Дай грошай на бутэльку!»*

Па словах Марыі Рамнаўны, хоць выпівакі адно перад адным выкабеньваюцца, што пілі і будуць піць, а ксяндзу Бульку на вочы трапляць баяцца.

— *Калі даўней некаторыя маглі нецвярозымі да касцёла падысці, і гэта лічылася нармальным, то ў мінулым годзе толькі аднаго п'янага на тэрыторыі комплексу заўважылі. А ў гэтым годзе ўвогуле такіх выпадкаў не здаралася. Яшчэ адна ўмова нашага ксяндза, каб на хаўтурах не было алкаголю. Бо другі выпʼе сто грамаў і нават на памінках гатовы запяяць...*

Старшыня Удзелаўскага сельскага Савета Віктар Казіміравіч Карман, які прымаў рашэнне наконт «зоны цвярозасці», лічыць, што жыхары Мосара мала-памалу звыкаюцца з новымі парадкамі.

— *Спачатку людзі наракалі, скардзіліся, што парушаецца Канстытуцыя*, — распавядае Віктар Казіміравіч. — *Але ў суд і райвыканкам ніхто так і не звярнуўся. Да рашэння ствараць «зону цвярозасці» мы ішлі два гады. Дзейнічаць яно будзе да канца снежня, а пасля, магчыма, рашэнне будзе працягнута.*

Нават Віктар Казіміравіч, узважыўшы ўсе «за» і «супраць», лічыць, што ідэі «зонаў цвярозасці» могуць прыжыцца не паўсюль.

— *У нас дзейнічае моцная духоўная абшчына*, — працягвае старшыня сельвыканкама. — *Мала прыезджых людзей. Таму і пітушчых не так шмат. З іншага боку, вясковая крама, у якой забараняюць прадаваць алкаголь, штомесяц губляе каля 20 мільёнаў рублёў. Таму ідэя «зонаў цвярозасці» шмат для каго — даволі спрэчная.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Чаму ў сталіцы зноўку дазволілі начны продаж спіртнога?

Свая барацьба з алкагалізацыяй вядзецца ў сталіцы. Калі ў пачатку 2000-х у Мінску дзейнічала больш за 100 «начнікоў» з алкаголем, то ў 2005 годзе такіх крамаў засталося дзевяць. Колькі гадоў таму продаж спіртнога ў начны час увогуле забаранілі. Можна было купіць толькі адносна дарагія напоі — каньяк, брэндзі, віскі і інш. Такім чынам, «начнікі» таксама пераўтварыліся ў своеасаблівыя «зоны цвярозасці».

А ў 2009 годзе продаж алкаголю ў начных крамах зноўку аднавіўся.

— *Прыкладна з красавіка гэтага года дазволілі прадаваць. Гэта было рашэнне раёна, прымалася праз пасяджэнне райвыканкама*, — распавядае «Звяздзе» **Зінаіда ПАБОРЦАВА, дырэктар кругласутачнага ўніверсама «Першамайскі»**, што ў сталічным мікрараёне Уручча. — *Тым не менш, продаж нашмат не вырас. А людзі перасталі лішні раз сварыцца — «дай ды прадай!». Толькі летам па начах істотна вырас продаж піва. А вось пладова-ягадныя віны ў начны час пад забаронай дагэтуль. Вельмі адказна адсочваем, каб алкаголь не прадаваўся няпоўнагадовым...*

> **Трэба, каб чалавек ішоў выпіваць у кавярню ці рабіў гэта дома, а не піў у грамадскім месцы. Праўда, кавярняў у нас пакуль мала, і гэта праблема...**

За сваю кар'еру Зінаіда Серафімаўна перабачыла ці не мільёны кліентаў, у тым ліку і алкаголікаў. У яе сваё меркаванне наконт таго, як адвучыць нашых людзей ад чаркі.

— *Чым больш забараняеш, тым больш узнікае жадання*, — лічыць Зінаіда Паборцава. — *Калі продаж забараняўся ў краме, свой бізнэс разгарнулі бабкі і таксісты. Чаго-небудзь дамагчыся можна толькі выхаваннем культуры спажывання ў людзей. Трэба, каб чалавек ішоў выпіваць у кавярню ці рабіў гэта дома, а не піў у грамадскім месцы. Праўда, кавярняў у нас пакуль мала, і гэта праблема...*

Не пагадзіцца з гэтай думкай складана. Яскравы прыклад такога падыходу — горад Прага. У чэшскай сталіцы больш за 100 тысяч (!) кавярняў і піўніц, яны знаходзяцца амаль у кожным жылым доме. Па вечарах пражане, шматлікія госці горада збіраюцца ў гэтых піўніцах і куляюць па кухлі-другім высакаякаснага піва. У выніку я, прабыўшы ў Празе больш за тыдзень, ані разу не пабачыў, каб нехта валяўся пад плотам. А ў плане крыміналу складана знайсці ў Еўропе больш бяспечны горад за Прагу. Вось гэта культура спажывання!

**Яўген ВАЛОШЫН.**

**У той час, калі краіна не можа справіцца з праблемай алкагалізацыі, паліцы крамаў «ломяцца» ад спіртнога.**



### ПРАБЛЕМА
## ЧАМУ Ў БАРАЦЬБЕ З АЛКАГАЛІЗАЦЫЯЙ ЧЫНОЎНІКІ ЦЕРПЯЦЬ САКРУШАЛЬНАЕ ФІЯСКА?

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, кожны беларус у сярэднім выпівае за год каля 12,4 літра чыстага спірту. Паказчык жахлівы. Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэджвае: небяспека вымірання нацыі існуе, калі адпаведны паказчык большы за 5 літраў спірту.

Калі выкрасліць са спісу насельніцтва краіны дзяцей і стрэйтэйджараў (асобаў, якія прынцыпова адмаўляюцца ад алкаголю. — **«Звязда»**), то больш-менш пітушчы наш грамадзянін спажывае каля 30 літраў чыстага спірту за год (75 бутэлек гарэлкі).

Непрыемна і тое, што танныя пладова-ягадныя віны займаюць больш за 30 працэнтраў абароту спіртнога ў Беларусі.

Многія чыноўнікі выказваліся за тое, каб выпуск такога «пойла» забараніць. Тым не менш «атрута» дагэтуль прадаецца па ўсёй краіне дзякуючы выключнай эканамічнай мэтазгоднасці.

Вось і атрымліваецца, што дзяржава, з аднаго боку, змагаецца з алкагалізацыяй, а з другога — падстаўляе сабе ж ножку, зарабляючы на выпівохах.

### ПОГЛЯД ПРАФЕСІЯНАЛА
## ЯК ПРАДУХІЛІЦЬ АЛКАГАЛІЗМ СЯРОД ПАДЛЕТКАЎ?

Ці ведаеце вы хоць адну беларускую сярэднюю школу, дзе б не праводзілі антыалкагольную прафілактыку? Толькі падлеткі часта прапускаюць агітацыю настаўнікаў міма вушэй і з яшчэ большым імпэтам пацягваюць піўко ў пад'ездах. Старшы трэнер зборнай Беларусі па тайскім боксе Дзмітрый Пясецкі даўно прафесійна вывучае псіхалогію дзяцей і ведае, як прадухіліць алкагалізм.

— *Перш-наперш, побач з дзіцем павінен быць бясспрэчны аўтарытэт, з якога хочацца браць прыклад*, — раскрывае свае рэцэпты знакаміты трэнер. — *Калі ты ў адной зале трэніруешся з жывым чэмпіёнам свету, чалавекам, якога паказваюць па тэлевізары, то жаданне ўжываць алкаголь знікае. Здараецца, да мяне прыходзіць займацца падлетак ці маладзён, і я чую ад яго пах цыгарэтаў, перагару. Я не раблю заўвагаў. А з часам заўважаю — калі чалавек стабільна прыходзіць на заняткі, перагару ўжо няма. Людзі разумеюць, што калі ты трэніруешся, то алкаголь — гэта лішняе.*

*Важна запоўніць вольны час дзіцяці чымсьці цікавым. Калі гэтага не адбываецца, падлеткі цягнуцца па чарку. Адзін прафесійны настаўнік можа прадухіліць алкагалізм у сотняў ці нават тысячаў маладых людзей.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже объектов республиканской собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

| Наименование предмета аукциона | Здание блока цехов и право заключения договора аренды земельного участка | Железнодорожный подъездной путь и право заключения договора аренды земельного участка | Здание бытового корпуса со столовой и право заключения договора аренды земельного участка | Здание центральной заводской лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка | Здание инженерного корпуса и право заключения договора аренды земельного участка | Незавершенное строительством капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., г. Дрогичин, ул. Ленина, 204 | | | | | |
| Продавец недвижимого имущества | РУПП «Экзон - Глюкоза», г. Дрогичин, ул. Ленина, 204, тел. 01644 3 10 25, 3 00 84 | | | | | |
| Сведения о предмете аукциона | Здание блока цехов – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 3,5915 га, срок аренды – 25 лет | Ж/д подъездной путь – длина 2,1 км, ширина – 1,51м. Земельный участок площадью 2,5513 га, ограничения в охранных зонах линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений, срок аренды – 25 лет | Здание бытового корпуса со столовой – степень готовности – 55 %. Земельный участок площадью 1,0089 га, срок аренды – 25 лет | Здание центральной заводской лаборатории – степень готовности – 50 %. Земельный участок площадью 0,9081 га, срок аренды – 25 лет | Здание инженерного корпуса – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 1,1671 га, срок аренды – 25 лет | Незавершенное строительством капитальное строение – эстакада по сливу мазута, степень готовности – 65 %. Земельный участок площадью 0,1808 га (в т.ч. зем. участок 0,0888 га и зем. участок 0,0920 га), срок аренды – 50 лет |
| Условия аукциона | - использование объекта для осуществления предпринимательской деятельности; - создание и регистрация на территории Дрогичинского района юридического лица; - создание не менее 20 новых рабочих мест в 2009 году; - при организации производства, требующего соблюдения санитарной зоны, обеспечение выноса действующих складов РУПП «Экзон-Глюкоза» и РУП «Экзон» за пределы производства; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи | - использование объекта для предпринимательской деятельности, создание не менее 3 новых рабочих мест в 2009–2010 гг.; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи. | | | | |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 37 072 253* | 19 466 753* | 10 439 256* | 9 399 758* | 12 070 689* | 3 417 234* |
| Сумма задатка, руб. | 3 700 000 | 1 940 000 | 1 040 000 | 900 000 | 1 200 000 | 341 000 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения – по 18.12.2009 г. включительно | | | | | |
| Организатор аукциона | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 0162 20 87 85, 23 12 63, www.brest-region.by** | | | | | |

* определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены продажи права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.

Аукцион состоится **21 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 01.08.2009 № 142, от 13.10.2009 № 193.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 18 декабря 2009 года включительно.**

### Крымінал

## АГАРОДНІНУ КРАЛІ ТОНАМІ

У Кобрынскім раёне абрабавалі склады мясцовага райспажыўсаюза. Зладзеі забралі 2300 кілаграмаў бульбы, 135 кілаграмаў цыбулі, 240 кілаграмаў капусты, а таксама паўтара цэнтнера яблыкаў. Яны яшчэ прыхапілі з сабой электронныя вагі. Міліцыя адшуквае зламыснікаў.

**Яна СВЕТАВА.**

## ДАМОГСЯ

Да пенсіянера з Пінска падышоў незнаёмы і запатрабаваў 10 тысяч рублёў. Калі той заўпарціўся, то мужчына пашкодзіў кола яго аўтамашыны. На жыхара Пінска за вымаганне грошай заведзена крымінальная справа, ды і кола «Мерседэса» пацягнула на 400 тысяч рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# УВЕСЬ АЭРАПОРТ ЗБЕГСЯ ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА КАРАВАЙ ВАЛІ УЛАСІК СА СТОЎБЦАЎ

**Першае знаёмства з Валянцінай Канстанцінаўнай адбылося на вяселлі былых аднагрупнікаў. Менавіта там мне пашчасціла пакаштаваць незвычайны каравай, зроблены яе рукамі. Хросная маці нявесты расказала, што пякарскіх спраў майстрысе без малога 80 гадоў. Практычна 40 з іх яна радуе сваёй выпечкай увесь свет. Караваі бабы Валі ведаюць і Леанід Якубовіч, і Аляксандр Аверкаў, і работнікі Мінскага трактарнага завода... У той жа дзень вырашыла абавязкова пазнаёміцца з унікальнай каравайшчыцай асабіста.**

## «Не было б шчасця, ды няшчасце памагло...»

...любіць паўтараць жанчына.

Калі вы думаеце, што Валянціна Уласік — дыпламаваны хлебапёк, то памыляецеся. Па прафесіі яна... эканаміст. А здольнасць да выпечкі і старадаўнія рэцэпты перайшлі ў спадчыну ад бабулі. Захоўваліся, як кажуць, да лепшых дзён.

— Пякла і раней нешта час ад часу. Але ж за працай на любімы занятак не заўсёды знаходзілася вольная хвілінка. І вось у 1977 годзе перанесла сур'ёзную аперацыю. Урачы выратавалі. Далі мне другую групу інваліднасці. Засталася дома. У адчаі думала: «Ну чым займацца?» Падказала дачка, якая ў той час разам з бацькам іграла на вяселлях. «Мама, спячы нам каравай, трэба маладых павіншаваць ад музыкаў». Я пасля хваробы не магла хадзіць. Дык яны замесяць цеста, а я сяджу і ляплю фігуркі. Пасля трэба было мужавых хрэснікаў — а іх у яго ажно 18 — ажаніць. Ніводны не застаўся без каравая — сімвала заможнасці і шчасця маладых.

Вельмі хутка разляцелася слава пра караваі Валянціны Канстанцінаўны па ўсім раёне, таму прапанова ўступіць у Саюз майстроў народнай творчасці не прымусіла сябе доўга чакаць. І пачалося: Дзень горада ў Мінску, рэспубліканскія «Дажынкі», Дзень пісьменства, юбілеі розных арганізацый, прадпрыемстваў, прыватных асобаў... Мала якое свята абыходзіцца без здобных шэдэўраў стаўбцоўскай майстрыхі. Не зважаючы на цяжкасці з транспарціроўкай, гэтыя крохкія скульптуры аб'ездзілі, без перабольшвання, палову Еўропы. Германія, Галандыя, Бельгія, Чэхія, Польшча, Расія, Літва, Латвія — гэта толькі тое, што ўспамінаецца адразу. Поўны спіс тых месцаў, дзе дэгуставалі ўнікальныя караваі, спадарыня Уласік і сама не ў сілах прыгадаць. «Прасцей, мусіць, пералічыць месцы, дзе я не была», — смяецца Валянціна Канстанцінаўна.

***— І як за мяжой успрымаюць вашу выпечку?***

— Мяне паўсюль добра сустракаюць. Не так даўно наша мясцовая дзяўчына ездзіла на вяселле да сваёй сястры ў Турцыю. Дык папрасіла мяне спячы каравай для маладых. Баяліся, праўда, што ў самалёт яе з 14-кілаграмовай булкай не пусцяць. І, як аказалася, дарэмна: як толькі пабачылі каравай, дык выдзелілі для яго самае пачэснае месца ў самалёце. Увесь аэрапорт збегся паглядзець на мой каравай. У Турцыі, расказвала дзяўчына, таксама глядзелі на каравай, як на дзіва. Падсоўвалі тарты ўбок, — так хацелася кожнаму пакаштаваць хоць маленькі кавалачак беларускай булкі.

***— Вось на вашых вясельных караваях вялікая колькасць розных фігурак: тут і мядзведзі, і вожыкі...***

— Толькі не думай, мілая, што баба начапляла абы-чаго, — узгадвае наперад маё пытанне Валянціна Канстанцінаўна і пачынае вельмі артыстычна паказваць і расказваць. — Тут кожная цацка мае сваё прызначэнне. Я, аздабляючы кожны каравай, прамаўляю прымаўку, як калісь рабілі нашы продкі: **каб жылі, як галубочкі, каб шчабяталі, як сарочкі, каб не калоліся між сабой, як вожыкі, а былі здаровыя, як мядзведзі, каб не круціліся па жыцці, як вавёрка ў коле, а плавалі, як лябёдачкі, уставалі з пеўнямі, сакаталі, як гэтыя курачкі і цвілі, як гэтыя ружачкі. А буслікі кожны год у хатку, каб прыносілі па немаўлятку**.

***— А колькі ўсяго вясельных караваяў вы спяклі?***

— Мілая мая, я ж ужо амаль сорак гадоў пяку. Бог іх ведае, — шчыра адказвае Валянціна Канстанцінаўна. — Я нават да апошняга часу не ведала, колькі фігурак змяшчаецца на маіх караваях. Ніколі не лічыла. Дык людзі за мяне гэта зрабілі.

***— І колькі?***

— Кажуць, што пад сотню збіраецца.

***— Магчыма, у вас ёсць самы памятны каравай?***

— Для мяне яны ўсе самыя-самыя. Кожнаму стараюся зрабіць прыемнае.

***— А ўсё ж такі? Я чула, напрыклад, што вы вядучага праграмы «Контуры» зляпілі з цеста.***

— Адкуль вы ведаеце? *(Задаволена ўсміхаецца.)* Сапраўды пашчасціла трапіць на «Контуры», калі перадачы спаўняўся год. Я тады спякла каравай, у цэнтры якога былі вядучы праграмы Аверкаў і госці, з якімі ён ладзіў перадачу. Але гэтым мая фантазія не абмяжоўваецца. У мяне, напрыклад, была тэматычная кампазіцыя «Раніца ў нядзельку» паводле вядомай паэмы Коласа «Новая зямля». Там, уявіце, столькі дробязяў было выпечана, нават блінцы на стале, за якім снедала беларуская сям'я... Быў каравай і па байках Кандрата Крапівы, ведаеце ж яго «Жабу ў каляіне», ляпіла і трактар «Беларус» з трактарыстамі на юбілей Мінскага трактарнага завода. І «Звязду» вашу віншавала, па-мойму, у 2003 годзе. Усяго не прыпомніш...



## «Мы з зяцем ужо 30 гадоў разам»

***— Няўжо вы ўсё гэта выпеклі самі? — паказваю я на пяць вялізных караваяў, якія, паводле слоў Валянціны Уласік, з самага ранку чакаюць сваіх гаспадароў.***

— Ды дзе там, дзетка. Гады ўжо не тыя. Не ведаю, што б рабіла без дачкі і ўнучак. Яны пераехалі ў Стоўбцы з Мінска, калі я, пахаваўшы мужа, засталася адна. Ахвотна дапамагаюць выпякаць. Нават дзевяцігадовая праўнучка Лерачка не сядзіць без працы. Лепіць свае караваі, дзе з пластыліну, дзе з цеста. Я ж не забараняю. Ды і на зяця нарадавацца не магу.

***— Добры зяць?***

— Не тое слова. Ужо 30 гадоў разам мы з ім. Усё дапамагае. Усё робіць. І без яго б караваі не атрымаліся, бо і дровы нарыхтоўвае, і возіць мяне паўсюль... Вой, давайце я вам пакажу мой знакаміты пінжак (дастае з шафы). Бачыце, колькі ў мяне ўзнагарод (спіс лаўрэацкіх званняў гэтай таленавітай каравайніцы сапраўды доўгі). І гэта яшчэ не ўсе. Ведаеце, я ж яго апранала на сустрэчу з Філарэтам. Мы разам арганізоўвалі невялічкае свята для пацыентаў дзіцячага хірургічнага цэнтра першай Мінскай гарадской клінічнай бальніцы. Дык ён у мяне пытаецца: «На якім ты фронце ваявала?» Я кажу: на культурным. Ён усміхнуўся і сказаў: «Лепш на культурным фронце ваяваць, чым кроў праліваць». Так мне запомнілася гэта.

* * *

Якраз у той дзень, калі я наведала спадарыню Уласік, яе вырашыў праведаць і школьны сябар, якія прыехаў з Санкт-Пецярбурга. Калі ён, спакойны і стрыманы, зайшоў у дом, то ўбачыў сваю знаёмую сярод караваяў і незнаёмых людзей.

— Бачыш, Генка, журналісты да мяне прыехалі, бацькі маладых па каравае. Каб і хацеў, дык няма калі хварэць.

Ён жа вельмі трапна прамовіў у адказ: **«Як усіх паражэніш, тады і будзеш хварэць...» Вяселляў Вам, Валянціна Канстанцінаўна, без канца і краю.**

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

*Стаўбцоўскі раён.*

## Тэлесеткі

### РАСІЙСКІ ПЕРШЫ КАНАЛ НАБЫЎ ПРАВЫ НА БЕЛАРУСКАГА «СНАЙПЕРА»

**Шматсерыйная ваенная драма «Снайпер. Зброя адплаты» (з Дзмітрыем Пяўцовым і Марыяй Міронавай у галоўных ролях) — гэта ўжо другі кінапраект, які Белтэлерадыёкампанія сумесна з расійскімі і беларускімі кінематаграфістамі паспяхова рэалізавала як у мастацкім, так і ў камерцыйным плане.**

Яго папярэднік, серыял «Маёр Ветраў» паводле твораў Мікаля Чаргінца, пасля дэбюту ў Беларусі быў набыты для паказу ў некалькіх краінах, і ўжо, як сцвярджаюць стваральнікі, акупіўся і нават прынёс пэўны прыбытак.

«Снайпера» ўбачылі ўжо ва Украіне, а цяпер правы на паказ гэтага серыяла набыў расійскі Першы канал. «Цяпер і ў нас, і ў сумежных краінах назіраецца сітуацыя дэфіцыту якасных серыялаў, — лічыць старшыня БТРК Аляксандр Зімоўскі. — Мы былі проста абавязаны скарыстацца сітуацыяй, якая склалася, і ў нас гэта атрымалася».

Працэс стварэння ў Беларусі ўласных серыялаў працягваецца — на чарзе экранізацыя некалькіх дэтэктываў Вольгі Тарасевіч. Праўда, на галоўныя ролі ў гэтых міні-серыялах запрошаны зноў жа вядомыя расійскія акцёры — але, магчыма, тое робіцца якраз на перспектыву продажу фільмаў у Расію і ва Украіну?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Приорбанк
Открытое акционерное общество
RZB Group

**УТВЕРЖДЕНО:**
Решением
Наблюдательного совета
«Приорбанк» ОАО
Протокол № 8
от 12 ноября 2009 г.

**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО:**
Департаментом
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
30 ноября 2009 г.

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
### об открытой продаже облигаций «Приорбанк» Открытого акционерного общества 15-го выпуска

**1. Наименование эмитента (на белорусском и русском языках):**
На белорусском языке:
полное — «Пріорбанк» Адкрытае акцыянернае таварыства;
сокращенное — «Пріорбанк» ААТ.
На русском языке:
полное — «Приорбанк» Открытое акционерное общество;
сокращенное — «Приорбанк» ОАО.

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail):**
Юридический и почтовый адрес: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А, тел./факс 289 90 87, 289 91 91. Электронный адрес: info@priorbank.by.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда:**
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 412 279 277 350 (Четыреста двенадцать миллиардов двести семьдесят девять миллионов двести семьдесят семь тысяч триста пятьдесят) белорусских рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации:**
Периодическое печатное издание газета «Звязда» не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

**5. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):**
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00;
- в информационном центре «Приорбанк» ОАО (ежедневно, кроме выходных и праздничных дней): по телефону +375 17 289 90 87, 187 (в Минске), 487 (для абонентов velcom, Life :-), МТС).

**6. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:**
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным советом «Приорбанк» ОАО 12 ноября 2009 года, протокол № 8.

**7. Цель выпуска облигаций:**
Формирование ресурсной базы банка.

**8. Объем эмиссии, количество и форма выпуска облигаций и связанные с ними права:**
Объем эмиссии облигаций составляет 20 000 000 (Двадцать миллионов) долларов США.
Количество облигаций 20 000 (Двадцать тысяч) именных процентных бездокументарных неконвертируемых облигаций.
Серия «ПР-15», номера «00001-20000».
Облигации выпускаются в виде записей на счетах.
Владелец облигации имеет право на получение по ней номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигации, а также на получение дохода в виде процентного дохода, начисляемого на номинальную стоимость облигаций.

**9. Номинальная стоимость:**
Номинальная стоимость одной облигации 1 000 (Одна тысяча) долларов США.

**10. Период проведения открытой продажи облигаций, период обращения:**
Дата начала продажи: 03 декабря 2009 года.
Дата прекращения продажи: 03 июня 2010 года.
Период обращения облигаций: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года.

**11. Место и время проведения открытой продажи облигаций:**
Продажа облигаций осуществляется в «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 16.00 в рабочие в Республике Беларусь дни, и/или на аукционе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В день начала открытой продажи облигации продаются по номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода за текущий период.

**12. Срок обращения облигаций и период начисления процентов:**
Срок обращения облигаций: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года (1096 дней).
Дата погашения облигаций: 03 декабря 2012 года.
Период начисления процентов: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года (1096 дней).

**13. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций:**
Погашение облигаций осуществляется 03 декабря 2012 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО.
Дата закрытия и формирования реестра владельцев облигаций «Приорбанк» ОАО – 22 ноября 2012 года. Со дня закрытия реестра владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в дату погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего владельца, указанным в реестре владельцев облигаций «Приорбанк» ОАО на дату закрытия реестра.
Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

**14. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, и порядок его определения:**
Процентная ставка по выпуску облигаций – 6,5 % годовых. Выплата дохода по облигациям осуществляется в долларах США ежеквартально (1 раз в 3 месяца) в виде процентного дохода.
Даты выплат процентного дохода:
03 марта 2010 года,
03 июня 2010 года,
03 сентября 2010 года,
03 декабря 2010 года,
03 марта 2011 года,
03 июня 2011 года,
03 сентября 2011 года,
03 декабря 2011 года,
03 марта 2012 года,
03 июня 2012 года,
03 сентября 2012 года,
03 декабря 2012 года, (выплата процентного дохода и погашение облигаций).
Расчет дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период выплаты дохода по установленной процентной ставке.
Расчет дохода осуществляется по следующей формуле:

$$\text{Дп} = \frac{\text{Нс x Пс}}{100} \text{ x } \left(\frac{\text{Т365}}{365} + \frac{\text{Т366}}{366}\right),$$

где:
Дп – процентный доход по облигациям;
Нс – номинальная стоимость процентных облигаций;
Пс – ставка процентного дохода за период;
Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату его выплаты. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период (дату погашения).

**15. Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска облигаций (запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства Финансов Республики Беларусь):**
Эмитент производит возврат средств владельцам облигаций не позднее 10 рабочих дней со дня запрета или приостановки выпуска облигаций (запрете продажи).

**16. Дата и номер государственной регистрации облигаций:**
№ 5-200-02-0405 от 30 ноября 2009 г.

**17. Информация об обеспечении облигаций:**
Обеспечением исполнения обязательств по облигациям является собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала. Собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО по состоянию на 01 октября 2009 года равен 716 160,4 млн. руб. Эмитент осуществляет выпуск облигаций в пределах данных ограничений.

**18. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия и порядок досрочного погашения облигаций, условия гарантированного досрочного выкупа облигаций:**
Эмитент имеет право выкупить облигации для перепродажи или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно погашены по решению Эмитента. При досрочном погашении оплата производится в течение 6 дней с момента подачи заявки на досрочное погашение. Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» и/или на внебиржевом рынке, если иное не установлено законодательством.
За три рабочих дня до наступления срока выплаты процентного дохода и погашения облигаций обращение облигаций приостанавливается для сбора реестра владельцев облигаций.

**Временно и.о. Председателя Правления** **В.В. Дедюль**

**Главный бухгалтер** **В.В. Манцивода**

**УТВЕРЖДЕНО:**
Решением
Наблюдательного совета
«Приорбанк» ОАО
Протокол № 8
от 12 ноября 2009 г.

**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО:**
Департаментом
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
30 ноября 2009 г.

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
### об открытой продаже облигаций «Приорбанк» Открытого акционерного общества 16-го выпуска

**1. Наименование эмитента (на белорусском и русском языках):**
На белорусском языке:
полное — «Пріорбанк» Адкрытае акцыянернае таварыства;
сокращенное — «Пріорбанк» ААТ.
На русском языке:
полное — «Приорбанк» Открытое акционерное общество;
сокращенное — «Приорбанк» ОАО.

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail):**
Юридический и почтовый адрес: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А, тел./факс 289 90 87, 289 91 91. Электронный адрес: info@priorbank.by.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда:**
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 412 279 277 350 (Четыреста двенадцать миллиардов двести семьдесят девять миллионов двести семьдесят семь тысяч триста пятьдесят) белорусских рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации:**
Периодическое печатное издание газета «Звязда» не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

**5. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):**
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00;
- в информационном центре «Приорбанк» ОАО (ежедневно, кроме выходных и праздничных дней): по телефону +375 17 289 90 87, 187 (в Минске), 487 (для абонентов velcom, Life :-), МТС).

**6. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:**
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным советом «Приорбанк» ОАО 12 ноября 2009 года, протокол № 8.

**7. Цель выпуска облигаций:**
Формирование ресурсной базы банка.

**8. Объем эмиссии, количество и форма выпуска облигаций и связанные с ними права:**
Объем эмиссии облигаций составляет 10 000 000 (десять миллионов) евро.
Количество облигаций 10 000 (десять тысяч) именных процентных бездокументарных неконвертируемых облигаций.
Серия «ПР-16», номера «00001-10000».
Облигации выпускаются в виде записей на счетах.
Владелец облигации имеет право на получение по ней номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигации, а также на получение дохода в виде процентного дохода, начисляемого на номинальную стоимость облигаций.

**9. Номинальная стоимость:**
Номинальная стоимость одной облигации 1 000 (Одна тысяча) евро.

**10. Период проведения открытой продажи облигаций, период обращения:**
Дата начала продажи: 03 декабря 2009 года.
Дата прекращения продажи: 03 июня 2010 года.
Период обращения облигаций: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года.

**11. Место и время проведения открытой продажи облигаций:**
Продажа облигаций осуществляется в «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 16.00 в рабочие в Республике Беларусь дни, и/или на аукционе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В день начала открытой продажи облигации продаются по номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода за текущий период.

**12. Срок обращения облигаций и период начисления процентов:**
Срок обращения облигаций: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года (1096 дней).
Дата погашения облигаций: 03 декабря 2012 года.
Период начисления процентов: с 03 декабря 2009 года по 03 декабря 2012 года (1096 дней).

**13. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций:**
Погашение облигаций осуществляется 03 декабря 2012 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО.
Дата закрытия и формирования реестра владельцев облигаций «Приорбанк» ОАО – 22 ноября 2012 года. Со дня закрытия реестра владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в дату погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего владельца, указанным в реестре владельцев облигаций «Приорбанк» ОАО на дату закрытия реестра.
Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

**14. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, и порядок его определения:**
Процентная ставка по выпуску облигаций – 6,5 % годовых. Выплата дохода по облигациям осуществляется в евро ежеквартально (1 раз в 3 месяца) в виде процентного дохода.
Даты выплат процентного дохода:
03 марта 2010 года,
03 июня 2010 года,
03 сентября 2010 года,
03 декабря 2010 года,
03 марта 2011 года,
03 июня 2011 года,
03 сентября 2011 года,
03 декабря 2011 года,
03 марта 2012 года,
03 июня 2012 года,
03 сентября 2012 года,
03 декабря 2012 года, (выплата процентного дохода и погашение облигаций).
Расчет дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период выплаты дохода по установленной процентной ставке.
Расчет дохода осуществляется по следующей формуле:

$$\text{Дп} = \frac{\text{Нс x Пс}}{100} \text{ x } \left(\frac{\text{Т365}}{365} + \frac{\text{Т366}}{366}\right),$$

где:
Дп – процентный доход по облигациям;
Нс – номинальная стоимость процентных облигаций;
Пс – ставка процентного дохода за период;
Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату его выплаты. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период (дату погашения).

**15. Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска облигаций (запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства Финансов Республики Беларусь):**
Эмитент производит возврат средств владельцам облигаций не позднее 10 рабочих дней со дня запрета или приостановки выпуска облигаций (запрете продажи).

**16. Дата и номер государственной регистрации облигаций:**
№ 5-200-02-0406 от 30 ноября 2009 г.

**17. Информация об обеспечении облигаций:**
Обеспечением исполнения обязательств по облигациям является собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала. Собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО по состоянию на 01 октября 2009 года равен 716 160,4 млн. руб. Эмитент осуществляет выпуск облигаций в пределах данных ограничений.

**18. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия и порядок досрочного погашения облигаций, условия гарантированного досрочного выкупа облигаций:**
Эмитент имеет право выкупить облигации для перепродажи или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно погашены по решению Эмитента. При досрочном погашении оплата производится в течение 6 дней с момента подачи заявки на досрочное погашение. Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» и/или на внебиржевом рынке, если иное не установлено законодательством.
За три рабочих дня до наступления срока выплаты процентного дохода и погашения облигаций обращение облигаций приостанавливается для сбора реестра владельцев облигаций.

**Временно и.о. Председателя Правления** **В.В. Дедюль**

**Главный бухгалтер** **В.В. Манцивода**

Лицензия на осуществление банковской деятельности
НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.

# МУЖЧЫНЫ КАРЫСТАЮЦЦА МАБІЛЬНЫМ ІНТЭРНЭТАМ БОЛЬШ

**Беларускія мужчыны ў карыстанні інтэрнэтам праз свой мабільны тэлефон значна апярэджваюць жанчын: з усіх карыстальнікаў мабільнага інтэрнэту каля 75 % складаюць менавіта яны. Пра гэта расказаў у сваім выступленні на канферэнцыі па мабільных тэхналогіях, якая прайшла ўчора ў Мінску, Міхаіл Дарашэвіч, прадстаўнік кампаніі па інтэрнэт даследаваннях «Gemius». У той жа час, калі браць карыстанне інтэрнэтам праз камп'ютар, то тут нашы жанчыны амаль не саступаюць мужчынам: аўдыторыя сайтаў на 49 % складаецца з жанчын і на 51 % з мужчын.**



Калі лічыць мабільных карыстальнікаў інтэрнэту па ўзросце, то больш за ўсё ў сусветным павуцінні праз мабільнік жыве моладзь: 50 % усіх карыстальнікаў — маладыя людзі ад 15 да 24 гадоў.

Калі браць статыстыку карыстання мабільным інтэрнэтам па тэрыторыі, то жыхары Мінскай вобласці складваюць 32 %, што трохі меней у параўнанні з карыстаннем інтэрнэтам праз камп'ютар — там жыхароў Міншчыны 39 %, а астатнюю частку дзеляць іншыя вобласці прыкладна пароўну.

Больш за ўсё, як расказаў Міхаіл Дарашэвіч, беларусы выкарыстоўваюць для мабільнага інтэрнэту прыстасаванні фірмаў Nokia (42,8 % па звестках за лістапад) і Apple (42,7%), прычым доля Nokia паступова зніжаецца. Мабільныя тэлефоны і смартфоны іншых фірмаў выкарыстоўваюцца не так шырока.

Усяго ж па звестках на кастрычнік 2009 года кампанія «Gemius» налічыла ў Беларусі тры мільёны пяць тысяч шэсцьсот пяцьдзесят пяць карыстальнікаў інтэрнэту (праз камп'ютары і праз мабільнікі разам) ад 15 гадоў і старэйшых.

З кастрычніка гэтага года пачала лічыць карыстальнікаў сайтаў праз мабільнікі і кампанія «Акавіта». Як паведаміў яе прадстаўнік Леанід Мураўёў, яны за гэты час змаглі налічыць 150 тысяч такіх аматараў мабільнага інтэрнэту. З іх 45 % карыстаюцца паслугамі сотавага аператара Velcom, 36 % — МТС, 14 % — Life:), 5 % — Diallog. Прычым, як заўважыў Леанід Мураўёў, доля новага аператара Life:) пацiху расце, у тым ліку гэта звязана і з пачаткам аказання паслуг па тэхналогіі 3G. Больш за ўсё беларусы карыстаюцца тэлефонамі, а не смартфонамі — іх долі складаюць 86 % і 14 % адпаведна і, дарэчы, у 83 % з усіх выпадкаў беларусы «ходзяць» у інтэрнэт не непасрэдна праз тэлефон ці смартфон, а падключыўшы гэтае прыстасаванне да камп'ютара ў якасці мадэма. Падлічыла «Акавіта» і асаблівасці зацікаўленасцяў мабільных карыстальнікаў: перш за ўсё праз тэлефон наведваюцца сайты з «лёгкім» кантэнтам (выпадаюць з рэйтынгу, скажам, файлавыя хосцінгі, сайты з актуальнай інфармацыяй (навіны, надвор'е, абвесткі) і сайты са спецыфічнай інфармацыяй (букмекерскія канторы, фінансавыя інфарметры і, як ні дзіўна, сайты інтымнага характару). Ну а самым папулярным сайтам, на які заходзяць беларусы як праз мабільны тэлефон, так і проста праз камп'ютар, з'яўляецца Tut.by.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# 21 ПАПЯРЭДЖАННЕ

**Лістападаўскі настрой**

Яна не адразу яго заўважыла на першай сваёй студэнцкай «бульбе». Праз некалькі дзён са здзіўленнем даведалася, што ёсць яшчэ адзін аднакурснік, які ўвесь час спіць.

А ён і сапраўды ўвесь час спаў — рэакцыя на стрэс. Трэба ўявіць сабе, што значыць праз пяць гадоў працы на заводзе і на будоўлі нарэшце паступіць ва ўніверсітэт і раптам убачыць, што тут — адны дзеці.

Яна, як і ўсе астатнія студэнты на свежым паветры, увесь час хацела есці. Яны з дзяўчатамі прыносілі са сталоўкі хлеб і цішком цягалі ў гаспадароў мёд з біклагі. Вечарам з дыскатэкі яе праводзіў іншы, і яны цалаваліся.

Нарэшце яна яго ўбачыла. Але нічога не адчула, акрамя цікаўнасці. Потым яны аказаліся ў адной баразне. Ён спытаў яе: «Праўда, што ты з Кабардзіна-Балкарыі?». — Яна звыкла сказала: «Так», і звыкла расказала пра Эльбрус, Нальчык і свайго любімага сабаку.

Аднойчы ён піў разам з іншымі хлопцамі. Перабраў. І сказаў пра яе такое... У масавай літаратуры пра гэта не пішуць. Хлопцы былі вельмі ўражаныя. Ва ўсякім разе, адзін гэта запомніў. Праз некалькі гадоў пераказаў ёй. Але яна тады ўжо была замужам. За аўтарам. Яна толькі пасмяялася. Калі б гэта сказаў іншы, а яе будучы муж пачуў, без забойства не абышлося б. Яна доўга здзіўлялася шчасліваму збегу абставінаў.

Потым яны вярнуліся з «бульбы», і яна сябравала з іншымі хлопцамі, а на яго не звяртала ўвагі. Пакуль аднойчы на занятках пад ёй не зламалася крэсла. Ён сядзеў за яе спінай. Яна звалілася на спіну, ногі дагары — горш не прыдумаеш. Вельмі перажывала, што ён мог убачыць яе жудасныя старажытныя панталоны пад спадніцай. Яна ўвесь час мерзла пасля сваёй Кабардзіна-Балкарыі ў гэтай халоднай і снежнай Беларусі.

Пасля гэтага падзення яны апынуліся разам у чарзе ў сталоўцы, яны размаўлялі і смяяліся. Упершыню яна нешта адчула. Можа гэта было толькі жаданне зразумець: убачыў ён ці не? А можа падзяка за яго далікатнасць. Яна была ўпэўненая, што ўбачыў.

А ён проста даўно чакаў момант, каб з ёй загаварыць. Нічога, безумоўна, ён не бачыў, проста дзякаваў Богу, што такі момант, нарэшце, настаў. Цяпер ён мог прыйсці праведаць яе, калі яна захварэе. І яна захварэла. І ён прыйшоў. Не адзін, з сябрам. І яна закахалася ў яго сябра.

Не тое нават, каб закахалася, але рашыла, што закахалася. Дзявочае сэрца ўвесь час шукае прадмет для сваіх мараў.

Аднак той сябар яе не кахаў. Ён кахаў, і па-сапраўднаму, зусім іншую дзяўчыну. Якой пакуль не рашаўся прызнацца. Сябар сказаў ёй, што кахае іншую. Яна вельмі расстроілася. Нават залезла на дах інтэрната. Паглядзела ўніз і злезла. І паехала да яго.

Ён вельмі ўзрадаваўся. Асабліва калі яна спытала ў адчаі: «Ці ўзяў бы ты такую, як я, замуж?» — «Так!» — адказаў ён так палка, што яна на імгненне падумала: магчыма, ён кажа праўду.

Потым яны разам паехалі на практыку ў іншы горад. І ён насіў яе на руках праз лужыны. Вялікія былі лужыны, бо прайшлі моцныя ліўні. І смачныя былі чарніцы. Яна іх ела ўпершыню. У Кабардзіна-Балкарыі такой ягады няма.

А потым яны ажаніліся. Няправільна ажаніліся. Вырашылі яе бацькоў, якія былі супраць, паставіць перад фактам. Калі паставілі, то разыгралася сямейная драма, у выніку якой яны напісалі заяву аб разводзе. Яна з'ехала ў свой Нальчык. А ён застаўся. Ім абаім было цяжка. Яна пісала яму лісты, яе маці чытала іх, і драма разгаралася з новай сілай... Ён піў леваміцэцін, на які ў яго моцная алергія, і ўрач забараняла яму хадзіць ва ўніверсітэт. Яму гэта толькі і трэба было.

Праз два тыдні яны ўбачыліся. На занятках. Яны адышлі ў іншы бок калідора, далей ад знаёмых. Яны не ведалі, што казаць. Яны маўчалі. Іх сэрцы так балелі... А потым яна працягнула руку да яго пляча і яе ўсю пранізаў электрычны разрад. Моцны. Тады яна зразумела, што не зможа без яго жыць.

Але яны паспрабавалі. Яна зняла пакой і ён прыязджаў да яе тайна. Часам начаваў у пад'ездзе. Бо яна жыла з гаспадарамі і сяброўкай. У іншым баку горада. І ён не паспяваў на грамадскі транспарт. Яна таксама тайна прыязджала да яго. Аднак яго маці здагадвалася. Бо знаходзіла на навалачцы яе доўгія валасы.

Потым яна даведалася, што цяжарная. І вырашыла, што больш не будзе нікому хлусіць. Прызналася сваім бацькам, папрасіла даравання ў яго маці і пераехала да яго.

З таго часу яны пражылі разам 21 год. Сёння ён прынёс ёй у ложак флёксы. І дзецям яны купілі торцік. А самі пайшлі ў госці да сяброў. Сябры купілі фэндзюшніцу і пазвалі выпрабаваць.

Ён сказаў ёй напярэдадні: «У нас з табой кітайскі юбілей. 21-е папярэджанне».

Яны нядаўна прызналіся дзецям у тым, што аднойчы ў горадзе, дзе праходзілі разам практыку, яны скралі гучнагаварыцель. У калідоры выканкама. Яны думалі, што ўзялі часова пакарыстацца. Але міліцыя наладзіла за імі пагоню. Іх затрымалі і пагражалі паведамленнем ва ўніверсітэт. Абышлося.

— Гэта быў першы, але далёка не апошні вар'яцкі ўчынак, які я зрабіў дзеля вашай маці, — сказаў ён сынам. — Увогуле з таго часу я толькі і раблю, што дзіўлюся самому сабе.

Падлеткі ўважліва паглядзелі на бацькоў. Яны не чакалі. Яны зусім іншыя — спакойныя і прадказальныя. Пакуль. Таму няхай ведаюць.

Маці пацiснула плячыма. Яна так рада, што аднойчы пад ёй, больш чым 21 год таму, зламалася крэсла...

**Ніна РЫХЦІК.**

# Як атрымаць максімум карысці ад мікрахваляў?

**Карысная парада**

## Што пажадана ведаць пры выбары ЗВЧ-печы

**МАГЧЫМА, гэта не надта характэрна, але гатаваць я люблю. Вядома ж, калі ёсць вольны час у выхадны, паколькі ў кулінарнай справе імкнуся кіравацца прынцыпам: хочаш смачна паесці — рыхтуйся правесці на кухні палову дня. За такі час, напрыклад, можна натушыць бульбы, зварыць боршч, папярэдне падрыхтаваўшы ўсе інгрэдыенты і абсмажыўшы іх... Затое потым быццам бы як эканоміш час, бо ўвечары пасля працы застаецца толькі разагрэць стравы. Але і на гэта патрэбен час, якога вельмі часта катастрафічна не хапае. Таму апошнім часам пачалі задумвацца з жонкай наконт набыцця мікрахвалевай печы. Што сёння прапануе гандаль? У пошуках адказу на гэтае пытанне карэспандэнт газеты наведаў рынак у Ждановічах, а таксама з паўтузіна буйных сталічных крамаў, сярод якіх, напрыклад, былі ЦУМ, «Тэхніка ў быце», «Радыётэхніка», «Пяты элемент», «Электрасіла».**

### КОЛЬКІ ЕДАКОЎ У ХАЦЕ І ШТО ЯНЫ ЛЮБЯЦЬ?

Асартымент гэтай кухоннай электратэхнікі падаецца неабсяжным, таму любому пакупніку найперш трэба вызначыцца з крытэрыямі выбару. Першы, якім трэба кіравацца: колькі чалавек у сям'і? Ад гэтага будзе залежаць аб'ём унутранай камеры будучай пакупкі. Прадаўцы ў адзін голас даводзілі, што для трох-чатырох чалавек будзе дастатковым набыць мікрахвалевую печ на 20—23 літры. Адзінокаму халасцяку выключна для разагрэву прадуктаў хопіць і аб'ёму на 17 літраў. На вялікую сям'ю пажадана браць печ аб'ёмам ад 27 літраў. Праўда, тут ёсць свае нюансы, пра якія мы раскажам ніжэй.

Крытэрый другі — наяўнасць тых ці іншых функцый. Печ, дзе ёсць толькі функцыя мікрахваляў, будзе самай простай і адначасова таннай. Выкарыстоўваць яе можна будзе фактычна толькі для разагрэву ўжо прыгатаваных страў і размарозкі прадуктаў. Галоўны плюс — хуткасць, эканомія часу. Каб атрымаць нешта больш «сур'ёзнае», напрыклад, такую звыклую корачку, падобную як пры смажанні, спатрэбіцца дадатковая функцыя — грыль. Гэта калі ЗВЧ-печ абсталяваная выпраменьвальнікам цеплавога (інфрачырвонага) выпраменьвання. Яшчэ адной функцыяй з'яўляецца канвекцыя, г.зн. абдзіманне гарачым паветрам з дапамогай спецыяльных вентылятараў. У спалучэнні з мікрахвалямі канвекцыя паскарае працэс прыгатавання ежы. Гатаванне ў такой «хатняй памочніцы» будзе падобным на выкарыстанне звычайнай духоўкі. Але калі апошняя ў вас спраўна працуе, ці ёсць вялікі сэнс набываць мікрахвалевую печ з менавіта такой функцыяй?

Ёсць яшчэ інвертарныя мікрахвалевыя печы. Інвертары аўтаматычна рэгулююць узровень магутнасці, што дае хуткі і раўнамерны нагрэў, які дазваляе захоўваць больш вітамінаў і пажыўных рэчываў, чым пры гатаванні ў звычайнай мікрахвалевай печы. Інвертарнае кіраванне спалучаецца з канвекцыйным награвальнікам або грылем. Дарэчы, у продажы ёсць печы адной мадэлі — або з інвертарам, або без яго. Розніца ў кошце зусім невялікая.



### ГРЫЛЬ БУДЗЕ КВАРЦАВЫ АБО ТЭНАВЫ?

Вернемся да згаданага вышэй грыля, бо ён можа быць двух відаў: кварцавы або тэнавы. Чым яны адрозніваюцца? Кварцавая лямпа лічыцца больш эканамічнай, яна хутчэй награецца, не займае месца ў рабочай камеры, бо схаваная ў столі, што дазваляе без праблем мыць печ. З іншага боку, калі тлушч з цягам часу патрапіць на кварцавы грыль, адчысціць яго будзе складана. Гатаванне на такім грылі лічыцца найбольш набліжаным да жывога агню.

Тэн — гэта па сутнасці спіраль. Яна больш марудна, чым кварцавая лямпа, награецца, але і больш працяглы час потым захоўвае цяпло. Тэнавы грыль лягчэй чысціць. Ён можа мяняць становішча: апускацца і ўзнімацца, устанаўлівацца каля задняй сценкі. Падчас «шопінгу» давялося нават пабачыць адну імпартную мадэль ЗВЧ-печы з двайным тэнавым грылем. Прадавец даводзіла, што гэта вельмі зручна: адну спіраль усталяваў пад столлю, другую — каля адной са сценак. Страва прыгатуецца значна хутчэй (асабліва пры выкарыстанні іншых функцый печы), лепш прапячэцца. Толькі трэба памятаць, што тэнавы грыль спажывае больш электрычнасці, чым кварцавы, а самі спіралі «з'ядаюць» крыху карыснай прасторы ўнутры камеры. Таму пры выбары печы з такім грылем варта «накідваць» да аб'ёму мікрахвалевай печы некалькі дадатковых літраў (памятаеце нашу заўвагу ўверсе).

А ці патрэбны ўвогуле той грыль? Існуе дастаткова трывалае меркаванне, што гэтая функцыя непатрэбная, маўляў, так, як у духоўцы, тое ж мяса ў мікрахвалевай печы нават з грылем усё адно не згатуеш. Пра гэта «па сакрэце» распавёў адзін з прадаўцоў на рынку ў Ждановічах. Праведзенае міні-апытанне сярод знаёмых таксама засведчыла, што толькі ў адной сям'і мікрахвалевую печ свядома выкарыстоўваюць для прыгатавання мяса і вынікам тым задаволеныя. Але давялося пачуць і іншае меркаванне ад прадаўца крамы «Тэхніка ў быце». Па-першае, зазначыла жанчына, многія карыстальнікі не зусім правільна выкарыстоўваюць магчымасць рэгулявання магутнасці мікрахваляў, не ўлічваюць, што канкрэтна гатуюць. Па-другое, ужо, хутчэй, як гаспадыня прадоўжыла, з таго ж перамарожанага мяса нават у духоўцы прыгатаваць нешта сакавітае і вельмі смачнае дастаткова складана.

### ВАЖНЫ НЕ ТЫП КІРАВАННЯ, А МАГУТНАСЦЬ ПЕЧЫ?

Гэты крытэрый выбару мікрахвалевай печы асабіста мне падаецца другасным, але і абмінуць яго нельга. Цяпер ёсць тры тыпы кіравання: механічнае, сэнсарнае, тактавае (тактыльнае). Натуральна, механічнае самае простае — з дапамогай ручак, у печы адсутнічае электроннае табло. Сэнсарнае — гэта калі праз кнопкі вы выстаўляеце час на электронным цыферблаце. Апошні тып — гэта кіраванне праз ручку, паваротам якой і ўстанаўліваецца час на цыферблаце. Чаму аддаць перавагу? А да чаго чалавек больш прызвычаіўся! Для прасунутай моладзі, напэўна, гэта будзе сэнсарны тып, для людзей сталага ўзросту, якім не цікавыя такія «забавы» — механічны тып кіравання. Хоць, па праўдзе, у электроннага тыпу больш функцый. Наконт жа даўгавечнасці адзін з прадаўцоў адказаў так: маёй электроніцы далёка не адзін год, а служыць як новая, а мужчына нядаўна купіў з механічным кіраваннем, дык яно «паляцела» праз месяц. А бывае і зусім наадварот. Словам, тут выбар цалкам за вамі.

Больш важным падаецца звярнуць увагу на магутнасць печы. Вышэй мы расказвалі пра функцыі ЗВЧ-печаў — мікрахвалі, грыль, канвекцыю. Найменшае спажыванне электрычнасці ідзе пры выкарыстанні ўласна функцыі мікрахваляў — недзе 800—850 Вт. А кожная дадатковая плюсуецца да гэтай лічбы. Калі вы ўключылі грыль магутнасцю 1100 Вт, ваша мяса запякаецца ўжо пры спажыванні печчу амаль 2 кВт. А плюс яшчэ функцыю канвекцыі выкарыстоўваеце? А гэта ўжо дастаткова шмат. Мала таго, што трэба будзе заплаціць за электраэнергію, дык трэба разлічваць, ці вытрымае ваша праводка ўвогуле. Мікрахвалевая печ — дастаткова энергаёмістая тэхніка, таму пры карыстанні ёй трэба памятаць правіла: адначасова печчу, электрачайнікам, прасам, электрадухоўкай ці пральнай машынай нельга карыстацца, каб не застацца ўвогуле без электрычнасці. Ды самі па сабе печы з «поўным камплектам» функцый, натуральна, будуць самымі дарагімі.

### ЗЭКАНОМІЦЬ ДАПАМОЖА ЎЛАСНЫ МАНІТОРЫНГ

Безумоўна, нельга абмінуць бокам і інфармацыю пра кошты на ЗВЧ-печы. У цэлым яны вагаюцца ад прыкладна 280 тысяч да амаль 1 мільёна рублёў. Зразумела, у залежнасці ад фірмы-вытворцы і наяўнасці тых ці іншых функцый, аб'ёму печы. Найбольш танныя — айчынныя. Пры гэтым, як запэўнілі мяне ў адной з крамаў горада, па сваёй якасці яны не саступаюць замежнай кухоннай тэхніцы і карыстаюцца ў пакупнікоў устойлівым попытам.

Для тых, хто хоча зэканоміць уласныя грошы, варта наладзіць своеасаблівы маніторынг гандлёвых арганізацый горада. Калі вызначыліся з канкрэтнай мадэллю печы, не палянуйцеся праехацца па некалькіх крамах, з'ездзіце на рынак. Падчас сваіх вандровак заўважыў, што, напрыклад, аднолькавыя мікрахвалевыя печы замежнай вытворчасці на 20 літраў з грылем на 1100 Вт і інвертарам, магутнасцю мікрахваляў 850 Вт у дзвюх розных спецыялізаваных крамах мелі розніцу ў 90 тысяч рублёў. Згаданая вышэй па тэксце адзіная ўбачаная мадэль з двайным грылем (на 23 літры) у краме мела цэннік 643 тысячы рублёў, на рынку ў Ждановічах за гэтыж тавар прадавец прасіў 460 тысяч рублёў. Розніца тут складала больш за 180 тысяч. У спецыялізаванай краме па продажы складанабытавой тэхнікі ўпадабаная мадэль з аб'ёмам 21 літр, грылем на 1100 Вт, праўда, без інвертара, магутнасцю мікрахваляў 800 Вт каштавала 555 тысяч рублёў. За дакладна такую ж печ на рынку трэба было аддаць на 60 тысяч меней. Мы заўсёды пішам, што пакупка на рынку мае права «на жыццё», калі прадавец пры пакупцы гатовы даць пакупніку ўсе патрэбныя дакументы: чэк, гарантыйны талон. Дык вось у нашых выпадках гандляры без праблем гатовыя былі выканаць такую просьбу. Але ў любым выпадку — вызначацца з месцам куплі вам асабіста.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ЦАР» І БОГ, або Тыя, хто здзекуюцца з нормаў




Два маладыя чалавекі ў мет ро гучна слухаюць музыку з мабільнага тэлефона. Грае Лепс. Хлопцы, як водзіцца, апранутыя па апошняй модзе: выцертыя джынсы, вузкі нос чаравікаў і чорная куртка з мехам. Спрабуюць падпяваць. Не атрымліваецца. Тады бяруцца падтанцоўваць. Гэта лепш.

— О, наступны твой, — кі малады чалавек на сябра і па вае гучнасць.

Наступны трэк — яго любімы, здагадваюся я. Не тое, каб я не шаную творчасць Рыгора Лепса, але зараз так не хочацца слухаць яго з дынамікаў чужога тэлефона.

## Камедыйны фільм «Цар»

Я еду з кіно. Глядзела «Цара». Разам з сяброўкай. Мы нават не абмеркавалі карціну. Моўчкі выйшлі з кіназалы, кіўком развіталіся і разышліся ў розныя бакі. Проста хацелася памаўчаць. Перажыць у сабе, абмазгаваць... А тут гэты Лепс. Чамусьці заўсёды ў такі важны момант знойдуцца тыя, хто не паважае іншых, не падзяляе іх пачуццяў і здзекуецца з агульнапрынятых нормаў.

У кіно мы сядзелі перад кампаніяй хлопцаў. Не разгледзела ў цемры, але амаль упэўнена: яны былі апрануты ў выцертыя джынсы, чаравікі з вузкім носам і чорныя курткі з мехам. Пацягвалі піва, перыядычна размаўлялі па тэлефоне і гучна смяяліся з героя Пятра Мамонава.



Яны былі такія не адны. Пасля сеансу ў зале засталося шмат бутэлек, пакетаў, паперак. На выхадзе я міжволі падслухала размову па тэлефоне хлопца, таксама апранутага па апошняй модзе.

— Не, я проста ў кіно быў. На «Цара» хадзіў. Камедыйны такі фільм...

## Жыццё аблокаў

Ёсць у апошнім альбоме гурта «Без білета» задушэўная лірычная песня, прысвечаная дачасна памерлым сябрам. Перад тым, як праспяваць яе на канцэрце-прэзентацыі, Віталь Артыст ушанаваў светлую памяць і нагадаў пра прысвячэнне. Аўдыторыя прыціхла. Заблішчэлі агеньчыкі запальніц. Але былі ў зале і тыя, модна апранутыя, якія не чулі, ці не хацелі чуць слоў-прысвячэнняў і слоў песні. Як і на працягу ўсяго канцэрта, яны крычалі сваё гучнае і працяглае «А-а-а-а! У-у-у-у! Без-бі-ле-та!».

Однажды будем вместе с этой высоты
Смотреть, как коротка жизнь у облаков...

Так са сцэны ім адказваў Артыст, не звяртаючы ўвагі на непавагу.

## Разумныя бландзінкі

Адзін мой знаёмы АМАПавец, хлопец з прыгожай спартыўнай фігурай, мяняе дзяўчат па два разы на тыдзень. І ўсе ў яго даўганогія бландзінкі. А ён цар і бог у амапаўскай форме ці ў гламурнай кофце са стразамі.

— Ведаеш, мне так надакучылі гэтыя бязглуздыя прыгажуні, — неяк падзяліўся са мной спецназавец. — Хочацца пазнаёміцца з дзяўчынай, якая ўмее думаць, з якой цікава размаўляць. Навошта яе цягнуць у першы вечар у ложак?

— Так, ты маеш рацыю, — адказваю я яму па-беларуску.

— А ты — дыктафон. Але прычым тут работа?

На гэтым наша размова пра разумных дзяўчат для амапаўца скончылася.

## Ад чаго сыходзіць першае каханне

Першае каханне прыйшло да мяне ў 15 гадоў. Зусім маладое і наіўнае. Напэўна таму і кахала за прыгажосць. Прыгажосць твару, а не ўчынкаў. Ён быў высокім, з прыгожанькім тварам, модна апранаўся. Унутранага свету я не ведала. Размаўлялі мы мала, усё больш вучыліся цалавацца. Мне здавалася, што ён разумее мяне без слоў. Я тады спрабавала пісаць вершы. Здавалася, ён натхняў.

Неяк давялося мне выступаць на сцэне нашага раённага клуба. Прэзентавала сваю баладу са збітым сюжэтам пра лебядзіную вернасць. Чытала са слязьмі на вачах. Зала таксама рыдала. Нават хлопцы-аднакласнікі не стрымлівалі эмоцый. І толькі мой каханы на галёрцы выдурняўся з сябрам. Я глядзела, як ён корчыў рожыцы, і ўжо плакала ад таго, што наканавана маім пачуццям. Яны сышлі не хутка. Праз тры гады. Але пачалі сыходзіць у той самы момант.

Ён і сёння модна апранаецца, добра зарабляе, прыгожа стрыжэцца, не верыць у лебядзіную вернасць. Ён па-ранейшаму не чытае вершы, а на «Цара» ходзіць з півам. І я перыядычна бачу яго на вуліцах, у транспарце, у краме, нават у тэатры. Вы таксама сустракалі яго. Неаднойчы. І чамусьці менавіта ў той момант, калі проста хочацца памаўчаць, абмазгаваць, перажыць у сабе.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

## Абзац

◢ Браслаўскім выратавальнікам давялося вызваляць мужчыну з глінянай пасткі. Нецвярозы 61-гадовы грамадзянін каля катлавана дома, які будуецца, упаў у размытую вадой гліну. Гліна засмактала яго з сілай, што не саступае балотнай дрыгве. Каб дастаць пацярпелага, выратавальнікам давялося выкарыстоўваць сані-валакушы і немалую фізічную сілу, бо перасоўвацца ў гэтым вадкім пластыліне давялося вышэй за калена. У стане пераахаладжэння мужчына быў дастаўлены ў ЦРБ.

**◢ Справа па факце двайнога забойства ў вёсцы Астрэйкава распачата пракуратурай Віцебскага раёна. Трупы 87-гадовай і 82-гадовай сясцёр з чэрапна-мазгавымі траўмамі былі знойдзеныя ў іх доме. Пажылыя жанчыны былі забітыя паленам. Знікла як мінімум 40 тыс. рублёў. Ва ўчыненні злачынства падазраюцца два мясцовыя жыхары. Аднаму з іх 27 гадоў, другому — 22.**

◢ Буйное ДТЗ адбылося ў Салігорскім раёне. Паблізу вёскі Ясковічы 24-гадовы мінчанін, кіруючы аўтамашынай «Субару», выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з «Фордам», якім кіраваў 29-гадовы жыхар Лунінецкага раёна. У выніку ДТЗ абодва вадзіцелі і сямігадовая дачка аднаго з іх атрымалі траўмы і змешчаныя ў бальніцу. Загінулі бацька кіроўцы «Субару», маці кіроўцы «Форда» і жыхарка Лунінецкага раёна.

## Поўны абзац

**◢ Жыхар Маладзечанскага раёна вылiў у каналізацыю 250 л самагону. Яго затрымалі супрацоўнікі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі, а таксама патрульна-паставой службы Маладзечанскага РАУС у момант вырабу самагону. Ад часткі ўжо гатовага да ўжывання спіртнога напою затрыманы паспеў пазбавіцца, заўважыўшы міліцыянераў. Аднак супрацоўнікам міліцыі ўдалося канфіскаваць 12 л самагону, а таксама 10 т брагі і самагонны апарат.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# На помніку 1000-годдзя Брэста выправілі памылкі

## Адбылося гэта пасля публікацыі ў «Звяздзе»




**У нумары ад 30 ліпеня мы паведамілі пра прыкры недагляд у Брэсце: на помніку 1000-годдзя горада было дапушчана 75 граматычных памылак! Большасць з іх былі аднолькавыя — у шрыфце адсутнічала літара «ў».**

Тады «Звязда» самая першая напісала пра гэты факт, а ў Брэсце паабяцалі нам усё выправіць.

Абяцанне стрымалі — у мінулую суботу на помніку з'явіліся новыя дошкі з надпісамі. Літара «ў нескладовае» заняла сваё пачэснае месца пасля галосных. «Днепра-Бугскі» канал справядліва стаў «Дняпроўска-Бугскім», а «Вялікае княства Літоўскае» цяпер паважна пішацца «Вялікае Княства Літоўскае».

Тэкст падрэдагавалі і скарацілі — відаць, каб менш было прасторы для памылак. У таблічцы, прысвечанай XVI стагоддзю, знікла згадка пра Рэч Паспалітую. Пэўна, таму, што на старой таблiцы адразу пасля ўсталявання нейкія хуліганы-палонафобы спілавалі гэтыя словы. Вырашылі, мусіць, не правакаваць дурняў.

Аднак чамусьці не ўсе заўвагі «Звязды» былі ўлічаныя. Берасцейская ікона Маці Божай так і засталася «асвЯчана» (замест «асвЕчана»).

— Усе дошкі сапраўды былі замененыя, — распавёў «Звяздзе» Рыгор БЫСЮК, начальнік Упраўлення культуры аблвыканкама. — Мы паўторна даслалі тэксты на ўзгадненне ў Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук, яны нам усё зацвердзілі.

— Наконт «асвЯчана» дадам, што менавіта так нам і ўзгадніла Акадэмія навук, — кажа галоўны спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Упраўлення культуры аблвыканкама Леанід НЕСЦЯРЧУК. — Мы спецыяльна акцэнтавалі на гэтым увагу і атрымалі такі адказ.

— А прозвішчы старшыні гарвыканкама і архітэктара мы выправілі адразу ж пасля публікацыі ў «Звяздзе», — дадае намеснік старшыні гарвыкнакама Вячаслаў ХАФІЗАЎ. — Зроблена гэта было на самім помніку, без дэмантажу кнігі летапісца.




Не будзем апускацца да драбязы і падлічваць, колькі дзяржаўных грошай можна было б ашчадзіць, каб з першага разу напісаць пісьменна.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота Жанны СІДАРУК і Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

## Дзеткі...

### ВАСЬМІКЛАСНІК-ШКОДНІК

**У Смалявічах больш за дзясятак аўтааматараў пацярпела па віне зламысніка, якому нечым «не дагадзілі» іх «жалезныя коні».**

Напачатку па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуліся двое мясцовых жыхароў, якія паведамілі, што ў ноч з суботы на нядзелю невядомы на вуліцы Навасёлаў з хуліганскіх намераў пашкодзіў колы іх аўтамабіляў. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, акрамя як у гэтых машын, колы былі пашкоджаныя яшчэ ў дзесяці аўтамабіляў, што стаялі на згаданай вуліцы і вуліцы Маладзёжнай. Як выявілася, падазраецца ў злачынстве 14-гадовы вучань 8 класа мясцовай школы, у дачыненні да якога ўзбуджаная крымінальная справа. Застаецца толькі паспачуваць бацькам школьніка, якім ён «падкінуў» яшчэ тыя праблемы...

**Ігар ГРЫШЫН.**

### САБАКА НЮХ МАЕ

**Навучэнец каледжа з Кобрына заявіў у міліцыю, што нехта выбіў шыбу і выкраў з яго дома камп'ютар.**

Аператыўнікі прыехалі са службовым сабакам, які і прывёў іх да злодзея — навучэнца гэтага ж каледжа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 23 (623)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

*Прадаецца*

❒ Дом у г. Крычаве, 200 кв. м. Тэл. 8 029 606 08 78.

❒ Прадам 1/3 долю 2-пакаёвай кватэры ў г. Рагачове, танна. Тэл. 8 029 778 33 38.

❒ Дача, летні шчытавы домік 2 км ад Дзяржынска, участак 10 сотак, сад. Тэл. 8 044 470 29 28.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, з усімі выгодамі, у г. Кобрыне. Тэл. 8 029 824 98 24.

❒ Дом у в. Жацiснае Лагойскага раёна (65 кв. м), маюцца г/пабудовы, сад, агарод. Тэл. 8 029 775 64 38.

❒ «Пежо 406» 1997 г.в., 1,9Д, сіні седан, выдатны стан. Тэл. 8 029 264 59 22.

❒ Гараж у Мінску, на скрыжаванні вуліц Някрасава—Карастаянавай, 9 тыс. у.а., торг. Тэл. 8 029 647 02 19.

❒ Парасяты в'етнамскай травяной пароды (Навагрудскі раён). Тэл. 8 01597 99 695.

❒ «Форд-Эскорт» 1998 г.в., 1,9 ТД. Тэл. 8 029 766 15 27.

❒ Кабан жывой вагой, 7 тыс. руб. за 1 кг. Тэл. 8 029 507 58 61.

❒ Каляска інвалідная (г. Барысаў). Тэл. 8 01777 45 923.

❒ Эл. пліта шклокерамічная (Брэст) новая, памер 50х57 см. Тэл.: 8 017295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Рабочая кабыла «советский тяжеловоз» з радаводам, узрост 4,5 года, жарэбчык — 7 месяцаў. Тэл.: 8 01795 95 808, 8 029 962 30 35.

❒ «ВАЗ-2103» 1980 г.в., тэхагляд на 2010 г. Тэл.: 8 017 205 96 50, МТС 261 21 19.

*Куплю*

❒ Трактар Т-25. Тэл.: 8 029 504 48 58, 8 01719 51 355.

❒ Трактар МТЗ ці Т-25 у любым стане. Тэл. 8 029 761 64 79.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________

Подпіс ________________ Дата __________

Два полюсы



# БЫЛЫЯ — ЦЯПЕРАШНІЯ

Адзін мой добры знаёмы Канстанцін у справах палюбоўных — або арыгінал, або проста ідзе па жыцці, як па хвалях лодка плыве. І не зразумеў поўнасцю я гэтага чалавека, хаця знаёмыя мы з дзіцячых гадоў. Тое, што з яго жыцця серыял здымаць можна, — гэта факт. Айчынныя кінематаграфісты, прадаю цікавы і насычаны падзеямі сюжэт.

Куды цячэнне жыццёвае — туды і ён. Пры гэтым і не дурань, і прыемны чалавек. Мяккі па характары, але з прынцыпамі, гонарам. Раней сустракаўся ён з жанчынай Кацярынай. Гадоў пяць, нават больш. І да яе сваякоў разам у госці хадзілі, і да ягоных.

А ў пачатку ўсё, як шмат у каго. Ну, выпадковае знаёмства, разам на каву, піва. Ну, заставайся на ноч. Яна, безумоўна, па сваёй жаночай логіцы лічыла яго сваім — «перспектыўным», патэнцыйным мужам. Праўда, паралельна сустракалася з іншымі. Ды і ён, было — не манах. Свабодны мужчына.

Пазнаёміла Каця свайго Канстанціна са сваёй лепшай сяброўкай Аляксандрай. І ўжо літаральна на наступны дзень... Здарыўся ў іх «раман» з усімі інтымнымі наступствамі.

Нездарма гавораць, што нельга знаёміць палюбоўніка з сяброўкай. А ў той — Сашы, раней быў няўдалы раман. Некалькі месяцаў Аляксандра і Косця не хацелі прызнавацца Каці ў тым, што ёй фактычна здрадзілі. Каця — не дурніца, здагадвалася пра ўсё. Але, як кажуць, «трымала паўзу». Ужо і не памятаю, як яны там прызналіся Кацярыне ва ўсім. Але факт — і сёння ўсе «сябруюць». У Косці і Сашы дзеці, Каця — сяброўка Сашы.

Што цікава, жанчыны па-ранейшаму і пагаварыць шчыра могуць — і пра мужыкоў, і пра «балячкі». Разам ходзяць у горад пагуляць, у кавярню. З Канстанцінам Каця стараецца трымацца па-ранейшаму, праўда, зразумела, ужо без інтыму.

А той — ці не можа вынесці «работы сумлення», ці... Ну, не ўспрымае больш былую — Кацю. Калі жанчыны сустракаюцца, калі ён побач з імі, стараецца нейкім чынам знікнуць — на працу, да таварыша «па важных справах». Тыя — ды куды ты? Маўляў, заставайся, нам без цябе сумна.

На мінулым «Славянскім базары» Каця і Саша разам пайшлі на канцэрт. З дзецьмі застаўся Косця. Саша тэлефануе — купіла сабе падарунак «ад цябе». Упрыгажэнні. «Ты стаіш?» — пытае Саша. «А што?» — неяк спужаўся і цяпер яшчэ закаханы. «Каштуе... 600 тысяч рублёў».

У яго ногі падкасіліся. І так грошай не хапае — дзецям, крэдыт выплачваць. Потым Саша трохі супакоіла: «Каця нам пазычыла, будзеш аддаваць ёй кожны месяц па 100 тысяч рублёў. Натуральна, я перадаваць буду, так што не хвалюйся, можаш не траціць час, каб прывозіць грошы...»

Мужыку цяпер даводзіцца брацца за любую халтуру. І зрабіў ён сваю мужчынскую выснову — проста былая нейкім чынам помсціць і цяпер. Разумее ж, што сума вялікая. Магла б параіць сяброўцы менш патраціцца?



З большасцю маіх былых стасункі самыя добрыя. Ні шкадавання, ні крыўды. Мо таму, што яны — не сяброўкі маці маіх дзяцей? Сэкс з былымі? У некаторых бывае і такое. Вось, жанчына скасавала шлюб. Знайшла сабе палюбоўніка — нарадзіла ад яго дзіця. А былы муж дзяцей сумесных чамусьці не хацеў. Іх справы. Былы перыядычна як таварыш тэлефанаваў былой. Быў у курсе яе жыцця, ведаў пра дзіця. Прапанаваў ёй нечакана сустрэцца, каб... Не паехала. А мо паехала? Свайму новаму сказала, што не.

Сэкс з былымі — гэта як «настальгія», жартуе мой калега. Мае рацыю. Упэўнены, што заўсёды можна заставацца людзьмі — у стасунках з былымі, новымі, будучымі. А з сяброўкамі сябровак лепш мець стасункі, як з начальствам. Мінімум — рабіць выгляд, што паважаеш, але ні на што не прэтэндуеш. Хоць як гэта цяжка бывае, калі бачыш такі цуд — з прыгожымі валасамі, ласкавы голас чуеш. Да чарговага цуду?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДАСТАВАЙСЯ Ж ТЫ... МІНУЛАМУ ЧАСУ!



Адна са шматлікіх мадыфікацый закону подласці чамусьці заўжды спрацоўвае на жанчынах. Гарантавана: як толькі ты вырашыш па-хуткаму збегаць у найбліжэйшую краму па хлеб — з нямытай галавой, ненафарбаваная, у старых трэніках і кофце «бывай, маладосць», або нават проста знянацку трапіш пад брудны «душ» з лужыны дзякуючы чарговаму шумахеру — тут жа з-за павароту з'явіцца тваё былое Вялікае каханне. Экс, прасцей кажучы. А тут ты. Разгубленая і ў трэніках. Жах, адным словам.

Але гэта яшчэ далёка не горшы варыянт сустрэчы з мінулым. Куды большая няёмкасць адчуваецца, калі гэта ён — у трэніках. І з цыгарэтай. І няголены... здаецца, апошнія паўгода. І пазнаў цябе з першага погляду, хоць апошні раз вы бачыліся стагоддзе таму. І цяпер гучна расказвае на ўвесь двор сабутэльнікам на лавачцы, якая ты шыкоўная жанчына. А ты, колеру піянерскага гальштука, разрываешся паміж памкненнем праваліцца, не сыходзячы з гэтага месца, і жаданнем тэрмінова знайсці тупы цяжкі прадмет для нанясення значных пашкоджанняў, толькі б не тлумачыць мужчыну, які цяпер з табой, хто гэта ўвогуле... добра яшчэ, калі твой бойфрэнд/муж/каханак належыць да homo, у пэўным сэнсе гэтага слова sapiens, і зразумее, што мінула з той пары 14 гадоў, і «няма таго, што раньш было» (толькі не трэба казак, быццам мужчына здольны ўвогуле праігнараваць факт з'яўлення на даляглядзе «былога»). А калі не, калі ён усім добры, ды раўнівы? Не хапала яшчэ, каб мінулае ставіла пад сумнеў вашу будучыню!

Мяне заўжды здзіўляла і бянтэжыла гэта мужчынская ўласцівасць — выбарачная памяць. Каханы чамусьці не ўзгадвае, што да вашага знаёмства быў зусім не анёлам, а хутчэй калекцыянерам — затое раўніва ўскідвае брыво, як толькі з табой павітаецца малады чалавек, знаёмства з якім абмяжоўваецца годам вучобы за адной партай. Былыя таксама радуюць: яны не помняць дакладна, з-за якіх «дробязяў» вы рассталіся, але цвёрда памятаюць, што паміж вамі «было». А значыць, згасла не зусім, і яшчэ быць можа... І не важна, што вы катэгарычна супраць, кожны мужчына ўпэўнены, што каго-каго, а яго вы забыць не ў стане. На гэтай падставе многія эксы працягваюць лезці ў жыццё колішняй пасіі, пры тым шчыра здзіўляюцца, калі жанчына не выказвае ахвоты «якнебудзь сустрэцца, пагаварыць за жыццё і пасядзець за кубачкам кавы... з усім, што адсюль вынікае». Прабачце, але, як казаў адзін з герояў «Самай абаяльнай і прыцягальнай» (мужчына, што рэдкасць!) — «Я не разумею, якія наступствы могуць вынікаць з кубачка кавы».

Зрэшты, па гісторыі, якую распавёў мой калега, выразна відаць — якія. Але гэта зусім не значыць, што нельга знаёміць палюбоўніка з сяброўкай. Калі і каханы, і сяброўка — сапраўдныя, і ты абаім цалкам давяраеш, то нічога не здарыцца, нават калі ты ў камандзіроўку на Паўночны полюс на паўгода выправішся. Калі ж не — хоць ты шыльду «Не лезь — заб'ю» вешай, але ў пэўны момант ці сяброўка стане былой, ці мужчына... Так што Каця з гэтай гісторыі — мудрая жанчына, якая здолела расставіць прыярытэты і захаваць самапавагу. А Косці нават не спачуваю, бачылі вочкі, што бралі, атрымаў тое, што заслужыў, так што цяпер няхай з няёмкасцю сам спраўляецца.

У ідэале можна не толькі развітацца цывілізавана, але і застацца сябрамі. Як гэта ўдаецца, напрыклад, гумарысту Яўгену Крыжаноўскаму, які захоўвае добрыя стасункі з чатырма (!) былымі жонкамі, а галоўнае, цешчамі — для мяне дагэтуль загадка. Часцей стасункі з былымі абмяжоўваюцца мімалётнай сустрэчай, дзвюма-трыма дзяжурнымі фразамі, усплёскам настальгіі, а потым уздыхам палёгкі: «Як добра ўсё ж, што разам з ім цяпер не я!». Не спрачаюся — ніколі не кажы ніколі. Але для захавання агульнага душэўнага спакою і руху наперад, лічу, мінулае трэба пакідаць у мінулым, а ў спалучэнні «мой былы каханы» націск ставіць на «былы».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.05 | 15.52 | 7.47 |
| Віцебск — | 8.01 | 15.35 | 7.34 |
| Магілёў — | 7.55 | 15.42 | 7.47 |
| Гомель — | 7.44 | 15.46 | 8.02 |
| Гродна — | 8.19 | 16.09 | 7.50 |
| Брэст — | 8.12 | 16.17 | 8.05 |

**Месяц**

*Поўня 2 снежня.*
*Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

**Імяніны**

***Пр.** Мікалая, Платона, Рамана.*
***К.** Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты — 1 снежня

**1917 год** — у Мінску адбыўся 3-ці з'езд саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, які адобрыў дэкрэты савецкай улады аб міры і зямлі.



**1934 год** — у Ленінградзе быў забіты Кіраў. Існуе версія аб прамым ці ўскосным дачыненні да гэтага самога Сталіна, хоць доказаў наконт гэтага няма ніякіх. Тым не менш, агульнапрынятым лічыцца тое, што забойства Кірава паслужыла пачаткам масавых рэпрэсій у СССР.

## Цытата дня:

*«Жанчыны — галоўныя выхавальніцы роду чалавечага».*
**Олівер Голдсміт (1728—1774), англійскі пісьменнік-сентыменталіст.**

Віншуем **з днём нараджэння Таццяну Мікалаеўну ГАЛІНСКУЮ** з г. Маладзечна. Жадаем моцнага здароўя, шчасця і добрага настрою. Няхай заўсёды і ўсюды вам спадарожнічае поспех, а нягоды абмінаюць.
**Дзеці, унукі.**

# ВЯСЕЛЬНЫ ПОЕЗД

Свет і сусвет чалавека

**Юнакі і дзяўчаты з дружыны маладога ўпрыгожвалі «транспарт» (брычкі, фурманкі, тарантасы) — у залежнасці ад мясцовасці і сацыяльнага становішча яго сям'і. Іх засцілалі саматканымі посцілкамі, упрыгожвалі кветкамі. Асабліва яркім быў воз, які ішоў першым — на ім ехаў жаніх. Дугу аплятали хвойкамі (галінкамі елкі ці сасны), а зверху прымацоўвалі некалькі стужак.**

- Для вясельнага поезда выбіралі самых моцных коней, якіх спецыяльна да гэтага дня чысцілі, падстрыгалі грыву і ў яе запляталі рознакаляровыя стужкі, хвасты завязвалі вузлом. Ні ў якім разе ў вясельным картэжы не выкарыстоўвалі тых коней, на якіх калісьці везлі нябожчыка.
- Самым галоўным атрыбутам усёй кампазіцыі ўпрыгожання былі званочкі, бразготкі, шархуны: пасярэдзіне мацавалі большыя, па краях — меншыя. Яны здалёк абвяшчалі жыхарам вёсак аб чарговай святочнай падзеі — стварэнні новай сям'і.
- У плане эзатэрычным, на ўзроўні тонкіх энергетычных структур, гэта быў знак-папярэджанне цёмным сілам саступіць дарогу і не ўзводзіць наўмысных злосных перашкод. У народным асяродку свята верылі ў магчымасць «зачаравання» дарогі, што магло стаць прычынай разладу ў сям'і ці нават ператварыць удзельнікаў вясельнага поезда ў маўклівыя прыдарожныя камяні. Святочнае гучанне званочкаў нейтралізавала, знішчала любыя чараванні і ачышчала дарогу ад усялякай псоты.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




# «ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

**Працягваецца штотыднёвая віктарына, адказы на пытанні якой, нагадаем, вы можаце дасылаць у рэдакцыю двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту з пазнакай «Звяздарыначка» на адрас рэдакцыі (220013 г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by). Удзельнічайце і перамагайце! Хочацца верыць, што вы ўпадабаеце гэтую новую інтэрактыўную інтэлект-рубрыку!**
**Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

## ДЗЯВЯТЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ



**1.** У якіх краінах (паводле сённяшніх межаў) мелі свае палацы князі Радзівілы?

**2.** Якія архітэктурныя помнікі Беларусі ўваходзяць у спіс ЮНЭСКА?

**3.** Аб мастацкім прызначэнні гэтага горада сведчыць у тым ліку і тое, што ў ім праходзілі першыя кінасеансы на тэрыторыі Беларусі. Што гэта за горад і калі адбыўся першы кінасеанс?

**4.** Які пісьменнік стварыў «летапіс айчыннай багны» ды «прапісаў» беларусаў на балоце?

**5.** Колькі гербаў, сцягоў і гімнаў было ў Рэспубліцы Беларусь?

**6.** Вялікі князь літоўскі, геніяльны палкаводзец, таленавіты дыпламат і дзяржаўны будаўнік, які павялічыў памеры нашай краіны больш чым у 2 разы. Ён забіў сваю знакамітую дзіду ў сцяну маскоўскага Крамля, чым сімвалічна прадэманстраваў моц ВКЛ. Хто гэта (здагадайцеся па малюнку)?



**7.** Гэтая літара кірылічнага алфавіта ўпершыню пачала выкарыстоўвацца ў XIX стагоддзі, а сёння ёй нават усталяваны помнік у Полацку. Што гэта за літара?

**8.** Якога музычнага інструмента, са слоў Францішка Багушэвіча, не хапала беларусам, каб жыць у дабрабыце ў сваёй краіне? А якія былі?

**9.** Да якога года БДУ меў статус Міністэрства?

**10.** Як, паводле падання, звалі продкаў сучасных людзей, што лёгка вырывалі велізарныя дрэвы з каранямі і перакідваліся праз усю Зямлю сякерамі?

**11.** Нацыянальная святыня беларусаў, створаная ў сярэдзіне XII стагоддзя, што захоўвала ў сабе кавалачкі Крыжа Гасподняга з кроплямі Ісусавай крыві, была прызначана напаўняць жыццёвай сілай душы жыхароў Беларусі ды знікла падчас Вялікай Айчыннай вайны. Што гэта?



**12.** Які народ, перасялены на тэрыторыю Беларусі напрыканцы XIII стагоддзя ды вядомы ліцвінам як «крымчакі», вызнаваў іўдаізм і да сённяшніх дзён захаваў сваю мову, што належыць да групы цюркскіх моў?

**13.** Які від гандлёвых шляхоў да пачатку XIX стагоддзя з'яўляўся на беларускіх землях прыярытэтным пры вядзенні замежнага гандлю?




### АДКАЗЫ НА СЁМЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ:

1. «Казюкі» (фэст Святога Казіміра праходзіў 4 сакавіка)
2. «Багародзіца»
3. «Белыя росы»
4. «Ладдзя Роспачы». Уладзімір Караткевіч
5. Свяцкі палац
6. Ян Булгак
7. З Чэхіі
8. «БелГрад»
9. У выніку пераходу Савецкай Расіі ў 1918 годзе на Грыгарыянскі каляндар, што ўмомант пераявіло ўсю краіну на 14 дзён наперад
10. Той Свет (месца пад зямлёй, дзе жылі злыя духі ды бажкі), Гэты Свет (месца на зямлі, дзе жылі хатнія духі, з якімі даводзілася сустракацца штодзень), Багонь (нябеснае гаспадарства, што размяшчаецца па-над зямлёю)
11. Жыровіцкі абраз Божай маці
12. «Песняры»
13. Астравецкая пляцоўка

**P.S.** ***Гэты тур віктарыны, мяркуючы па вашых адказах, быў даволі цяжкім. Асабліва шмат няправільных адказаў паступіла на першае і дзясятае пытанні (дарэчы, вельмі цікава было чытаць вашы меркаванні наконт светападзелу беларусаў — шмат абгрунтаваных міфалагічных версій). І, у дадатак, часам недакладнасці ўзнікалі і з вызначэннем зыходнага пункта грашовай адзінкі: часта «пражскі» грош вы накіроўвалі ў Італію... Нягледзячы на вельмі шчыльныя вынікі наверсе «пірамiды», у агульным заліку пакуль першае месца дзеляць паміж сабой Дар'я Вашкевіч і Аляксей Глінскі.***

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6**

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 13:



**Белыя:** b4, b6, c5, c7, d6 (5). **Чорныя:** a5, d8, e5, f4, g3, g5 (6). Выйгрыш.

Заданне вядучага рубрыкі праверана па электроннай пошце нашым кансультантам Антанасам Гімбутасам (Літва) на супадзенне і дакладнасць рашэння (па яго самай вялікай у свеце картатэцы).

У рамках жа **бліца-52/2** разгледзьце праблему-64:

**Белыя:** a1, a7, c1, e1, e7, f6, g3, h6 (8). **Чорныя:** a3, b2, c3, c5, d2, d4, e3, e5, f2, f8 (10). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

**АЎТАРСКІ-9**

Аб'яўляем яго з нормай першага спартыўнага разраду па міжнародных шашках і на прызы чэмпіёна свету па шашачнай кампазіцыі Уладзіміра Матуса, якому належаць усе 15 заданняў. Падаём **першае** з іх.



**Белыя:** 13, 19, 39, 41, 42, 43, 48 (7). **Чорныя:** 7, 21, 22, 24, 30, 34, 36 (7). Перавага белых.

Уладзімір Матус — наш зямляк з Гродзенскай вобласці, але зараз жыве ў Маскве, дзе працуе ў спецыялізаванай калегіі адвакатаў «Міжнародная юрыдычная кампанія». Адначасова ён прапануе правесці не толькі конкурс рашэнняў кампазіцый, але і іх складання ў жанры 100-клетачных мініяцюр. Кожны жадаючы можа даслаць дзве свае новыя задумкі, якія міжнародны гросмайстар сам ацэніць і для пяці пераможцаў падрыхтаваў сюрпрыз — сваю кнігу «Гранды России» (Москва, Графпресс, 2008). Так што запрашаем і ў гэтае спаборніцтва. Вашы творы чакаюцца на працягу трох месяцаў.

А цяпер завяршаем **бліц-51**:

№ 6. **Белыя:** 7, 12, 18, 20, 22, 30, 44, 46 (8). **Чорныя:** 10, 21, 31, 32, 33, 37, 39 (7). Атака белых.

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

**«Пагода ў доме»-6/9** (М. Грушэўскі): a3 (f2 A) g3, e7, b8 (b6) a7x. A (d6) e7, b8 (b6 A1) a7 (g5, g3) e3 (h2) I g1 (b4) d2 (a3) c3x. I a7? (b4) d2 (a3) c3 (b2!, g1)=. A1 (g5, g3) e3x.

**Бліц-51/2** (М. Грушэўскі): 14, 10, 32, 20, 8, 4, 1 (28) 44, 6, 50#.

**«Пара эцюдаў»** (Д. Камчыцкі): **№ 1.** b6 (e5 AB) d2 (h4) e1 (b6) f2 (a5) e1x. A (e:c5) f2x. B (ac5) b4, h6x; **№ 2.** e5 (b4 A) a3 (f2 B) g3, d6x. B (d2) c3x. A (a3) ed6x.

# Усміхнемся!

**Са мной жонка ўжо два дні як не размаўляе. Але я знайшоў выйсце — паклаў на ложак свае нямытыя шкарпэткі. Гутарка распачалася!**

☺

— Колькі браць, Воўчык?

— Вазьмі тры, каб за другой не бегаць!..

☺

**Калі Далю былі патрэбныя новыя словы, ён прыязджаў у вёску, разбіваў на вачах у мужыкоў 2-3 бутэлькі гарэлкі, а потым стаяў і запісваў.**

☺

— А я вось са сваім футбол гляджу! Ужо чатыры каманды вывучыла: «Дынама», «БАТЭ», «Прынясі піва» і «Падай газету»...

☺

**«У кожнай жанчыне павінна быць загадка», — сказала Маша і з'ела зборнік рэбусаў.**




# ДЗІЦЯ І КІРОЎЦЫ ПАЦЯРПЕЛІ Ў АВАРЫІ

**У нядзелю следча-аператыўная група МУС выбывала ў Салігорскі раён, каб на месцы разабрацца з усімі акалічнасцямі буйнога дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося на дарозе паблізу вёскі Ясковічы.**

Тут сутыкнуліся аўтамабілі «Субару» і «Форд». Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, першым кіраваў 24-гадовы мінчанін, які выехаў на паласу сустрэчнага руху. Што датычыцца аўтамабіля «Форд», то за рулём гэтай машыны знаходзіўся 29-гадовы вясковец з Лунінецкага раёна. Абодва кіроўцы і сямігадовая дзяўчынка ў выніку аварыі атрымалі цялесныя пашкоджанні і шпіталізаваныя. А вось бацька кіроўцы «Субару», маці кіроўцы «Форда» і жыхарка вёскі Ракітна Лунінецкага раёна ў гэтым ДТЗ загінулі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 6577. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12